Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава

# Беларуская мова 2

Частка 1



ВЫДАВЕЦТВА АВЕРСЭВ




**Беларуская мова. 2 клас.**
**Хвілінка чыстапісання**

*Л. Ф. Кузняцова*

Заданні дапаможніка накіраваны на развіццё і ўдасканальванне каліграфічных навыкаў вучняў. Матэрыял можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы для правядзення хвілінак чыстапісання, а таксама дома для замацавання навыкаў пісьма і арфаграфічных уменняў.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

aversev.by

# АЛФАВІТ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Аа | а | Аа | |
| Бб | бэ | Бб | |
| Вв | вэ | Вв | |
| Гг | гэ | Гг | |
| Дд | дэ | Дд | |
| Ее | е | Ее | |
| Ёё | ё | Ёё | |
| Жж | жэ | Жж | |
| Зз | зэ | Зз | |
| Іі | і | Іі | |
| Й | і нескладовае | й | |
| Кк | ка | Кк | |
| Лл | эл | Лл | |
| Мм | эм | Мм | |
| Нн | эн | Нн | |
| Оо | о | Оо | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Пп | пэ | Пп | |
| Рр | эр | Рр | |
| Сс | эс | Сс | |
| Тт | тэ | Тт | |
| Уу | у | Уу | |
| ў | у нескладовае | ў | |
| Фф | эф | Фф | |
| Хх | ха | Хх | |
| Цц | цэ | Цц | |
| Чч | чэ | Чч | |
| Шш | ша | Шш | |
| ы | ы | ы | |
| ь | мяккі знак | ь | — |
| Ээ | э | Ээ | |
| Юю | ю | Юю | |
| Яя | я | Яя | |

Спампавана з сайта www.aversev.by

# СТУЖКА ЛІТАР

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| б | г | з | д | дз | дж | ж | | р | ў | в | л | м | н | | | й | ь |
| п | х | с | т | ц | ч | ш | ц | | | | | | | к | ф | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| а | у | о | э | ы |
| я | ю | ё | е | і |

**Ч** горбіць казырок таму,
што ўсе з яго «**Чаго**?», «**Чаму**?».
**Чаму** гудзе сярдзіта чмель?
**Чаму** чапляе човен мель?
**Чаго**, калі спадзе вада,
чакае чапляў чарада?
**Чаму** чабор і чуб на **Ч**?
Чамучак-мучак шмат яшчэ.

*Р. Барадулін.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Алгарытм спісвання

1. Прачытай сказ і паўтары яго па памяці.
2. Прачытай усе словы ў сказе так, як яны запісаны. Растлумач напісанне слоў.
3. Прагаворвай кожнае слова падчас запісу сказа.
4. Зрабі самаправерку. Параўнай кожнае напісанае слова з узорам.

## Алгарытм пісьма пад дыктоўку

1. Уважліва паслухай тэкст. Запытайся пра незразумелыя словы.
2. Паслухай першы сказ і пастарайся яго запомніць.
3. Паслухай сказ яшчэ раз і запішы. Дыктуй сабе па складах.
4. Паслухай сказ яшчэ раз, зрабі самаправерку.
5. Уважліва перачытай і правер увесь тэкст.

## Алгарытм пісьма па памяці

1. Прачытай тэкст. Запытайся, калі штосьці не зразумеў.
2. Прачытай тэкст яшчэ раз. Растлумач напісанне слоў.
3. Паўтары тэкст некалькі разоў, пакуль не запомніш.
4. Запішы тэкст.
5. Зрабі самаправерку. Параўнай кожнае напісанае слова з узорам.

Спампавана з сайта www.aversev.by



## ЧУЕМ І ВЫМАЎЛЯЕМ

| *пад націскам* | | *не пад націскам* | |
|---|---|---|---|
| [о] | жо́луд | [а] | жалуды́ |
| [э] | стрэ́лы | | страла́ |

о,э ← ПІШАМ → а

## ПІШАМ

| *пад націскам* | | *у першым складзе перад націскам* | | *у іншых ненаціскных складах* | |
|---|---|---|---|---|---|
| е | лес | я | ля\|сні́к | е | ле\|сні\|кі́ |
| ё | клёкат | | кля\|ко́\|ча | | кле\|ка\|та́ць |
| | палёт | | ад\|ля\|це́\|лі | | вы́\|лет |

## ЛІТАРА Ў

### ПІШАЦЦА

*пасля галосных*

першы ўрок
праўда
чытаў

### НЕ ПІШАЦЦА

*пасля знакаў прыпынку*

вясёлае, **у**смешлівае сонейка

*вялікая літара*

малая **У**льяна

Спампавана з сайта www.aversev.by

Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2022

Спампавана з сайта www.aversev.by

УДК 811.161.3(075.2=161.3)
ББК 81.2Бии-922
А72

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт *С. М. Якуба*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Міханавіцкая сярэдняя школа» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *І. П. Папіціч*)

Спіс выкарыстаных крыніц размешчаны ў частцы 2 вучэбнага дапаможніка

## Умоўныя абазначэнні:

 — прабленмая сітуацыя, прабленмае пытанне;

 — трэба ведаць;

 — важная інфармацыя;

 — дамашняе заданне;


 — заданні на выбар;

* — значэнне слова пададзена ў тлумачальным слоўніку.

**ISBN 978-985-893-063-9 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-893-062-2**

© Антановіч Н. М., Антонава Н. У., 2022
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2022

Спампавана з сайта www.aversev.by

# РОДНАЯ МОВА

## Беларуская мова — дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь

**1.** Прачытайце верш. Якія словы аўтар называе святымі? Чаму?

Мір,
Радзіма,
мама —
усяму аснова.
Мір,
Радзіма,
мама —
нам святыя словы.

*В. Жуковіч.*



Здагадайцеся, якія словы «схаваліся» ў крыжаванцы. Запішыце іх.

У якім слове адзін гук абазначаны дзвюма літарамі? Падкрэсліце гэтыя літары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**2.** Складзіце словы з літар на пазлах.




Прачытайце. Дапоўніце сказ гэтымі словамі.

*Мы — беларусы. Наша*

*родная ... — ... .*

Запішыце другі сказ. Чаму трэба вывучаць беларускую мову?

**3.** Прачытайце верш. З чаго складаюцца словы, якія мы вымаўляем? Чаму аўтар называе гукі чароўнымі?

Роднае слова —
матчына слова.
З гукаў чароўных
выткана мова.

*У. Карызна.*



Знайдзіце і вымавіце словы, якія адпавядаюць схемам. Запішыце гэтыя словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**4.** Разгледзьце малюнак. Прадстаўнікоў якіх нацыянальнасцей вы бачыце на ім?



| | |
|---|---|
| язык | сшытак |
| словарь | раніца |
| утро | мова |
| тетрадь | слоўнік |

Прачытайце словы. У якім слупку размешчаны словы на рускай мове, у якім — на беларускай? Вусна аб'яднайце ў пары словы з аднолькавым значэннем. Запішыце словы на беларускай мове.



**5.** Прачытайце прыказку. Дапоўніце яе патрэбнымі словамі. Чаму так гавораць?

*Ласкавае ... — што ... ясны.*

Запішыце прыказку. **слова** **дзень**

## Вуснае і пісьмовае маўленне



— Чамучык! Якія ў вас з'явіліся новыя прадметы ў гэтым навучальным годзе? — пацікавілася мама.



Спампавана з сайта www.aversev.by

— Беларуская мова і літаратурнае чытанне, — адказаў Чамучык.

— Ты ўжо зрабіў па іх дамашнія заданні? — строга запыталася мама.

— Вуснае зрабіў, а пісьмовае яшчэ не! — сказаў хлопчык.

Падумайце, які з названых прадметаў вусны, а які — пісьмовы. Чаму?

Калі мы карыстаемся вусным маўленнем, а калі — пісьмовым?

**6.** Разгледзьце малюнкі. Якім маўленнем — вусным ці пісьмовым — карыстаюцца людзі?





Калі мы гаворым і слухаем, то карыстаемся **вусным маўленнем.**
Калі пішам і чытаем, то выкарыстоўваем **пісьмовае маўленне.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**7.** Прачытайце скорагаворкі. Якім маўленнем карысталіся дзяўчынкі? Якія словы паказваюць на гэта?

Добры верш дэкламава́ла*
слухачам сяброўка Ала.

Прачытала Іра правіла,
Іра Ігара папраўіла.

*М. Пазнякоў.*

Спішыце адну скорагаворку на выбар.

**8.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце яго патрэбнай інфармацыяй. Раскажыце, аб чым вы даведаліся.

Дзень беларускага пісьменства — дзяржаўнае свята ў нашай краіне. Яно адзначаецца ў першую нядзелю верасня. Ладзяць яго ў мясцовасці з багатай гістарычнай спа́дчынай*. Кожны год свята праходзіць у новым горадзе. Упершыню яго прымаў горад 

. Сёлета Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў горадзе ... .

Чаму важна валодаць пісьмовым маўленнем? Растлумачце.

Спішыце апошні сказ.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**9.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.



Хто са мною пасябруе,
той ужо не засумуе.
Языка хоць і не маю,
а пра ўсё апавядаю.
*М. Пазнякоў.*

Якім маўленнем карыстаецца чалавек, калі чытае кнігу? А калі піша кнігу?

Спішыце другі сказ. Запішыце адгадку.

## Родная мова. Ветлівыя словы

**10.** Прачытайце тэкст. Як зрабіць раніцу добрай?

### Добрая раніца

Узышло яснае сонейка. Асвяціла зямлю сваімі промнямі. Людзі сказалі адно аднаму ветлівыя словы: «Добрай раніцы!»

Які ветлівы выраз ужываецца ў тэксце? Якія ветлівыя словы ведаеце вы? Чаму гэтыя словы называюць чароўнымі?

Запішыце пад дыктоўку ветлівы выраз. Зрабіце ўзаемаправерку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**11.** Знайдзіце ветлівыя словы. У якіх сітуацыях імі карыстаюцца?



Сардэчнавітаемкаліласкапрабачце



Д_бр_дз_ньв_л_к_дз_к_йд_р_йц_см_чн_ _сц_

Запішыце адзін ветлівы выраз на выбар. Якія пачуцці ён перадае?

**12.** Прачытайце назву тэксту. Аб чым у ім можа расказвацца? Прачытайце тэкст, дапаўняючы яго патрэбнымі ветлівымі словамі.

## Сапраўдныя сябры

Аленка падвярнула нагу і ўжо некалькі дзён не хадзіла ў школу.

Алеся, Оля і Міша прыйшлі наведаць яе.

— ______, — павіталіся дзеці. — Мы да Аленкі.

— ______, праходзьце! — запрасіла Аленчына мама.

Дзеці расказалі Аленцы, што вывучалі ў школе, перадалі дамашнія заданні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

— вам, што не забылі пра мяне. Я ўжо хутка прыйду ў школу! — сказала дзяўчынка.

— , Аленка! Папраўляйся!

— ! — адказала дзяўчынка.

Аленка была рада. Добрыя ў яе сябры!

***Калі ласка*** ***Да пабачэння***

***Дзякуй*** ***Добры дзень*** ***Да сустрэчы***

Чаму дзеці прыйшлі да Аленкі?

Як бы вы ахарактарызавалі сяброў дзяўчынкі? Выкарыстайце патрэбныя словы: *чу́лыя, добрыя, няўважлівыя, клапатлівыя, раўнадушныя.*

Запішыце словы ветлівасці.

Прачытайце тэкст па ролях. Якім маўленнем карысталіся дзяўчынка і яе сябры?



Па-беларуску правільна гаварыць так: «Дзякаваць каму-небудзь за што-небудзь». Напрыклад: *дзякаваць сябрам за дапамогу.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

**13.** Прачытайце тэкст.

Якое заданне атрымаў Белячок ад Вожыка? Выканайце гэта заданне.

Сядзіць на бярозавым пяньку заяц Белячок і ўздыхае.

— Што здарылася, сусед? — пацікавіўся ў яго заяц Шарачок.



Белячок дастаў з кішэні ліст паперы, разгарнуў яго і паказаў Шарачку.

— Вожык нядаўна пісьмо прыслаў. Просіць, каб сярод напісаных ім слоў я знайшоў лішнія.

— Добрай раніцы, добры дзень, дзень добры, прывітанне, добры вечар, добра паспаў, добрай ночы, — прачытаў Шарачок і падумаў: «Цяжкае заданне даў Белячку Вожык». *(А. М. Якімовіч.)*

Разгледзьце малюнак. Якім маўленнем карысталіся зайчыкі?

Выпішыце з тэксту словы ветлівасці.

Прыдумайце заканчэнне размовы Белячка і Шарачка. Праінсцэніруйце яе.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**14.** Прачытайце загадку. З выдзеленых літар складзіце адгадку.

Кры**л**аў не м**а**е,
ды хутка лятае.
Выпу**с**ціш —
рад ці не рад,
а не зл**ов**іш назад.

*М. Пазнякоў.*

Чаму трэба адказна ставіцца да таго, што гаворыш? Запішыце першы сказ і адгадку.

Спампавана з сайта www.aversev.by

# ГУКІ І ЛІТАРЫ

## Гукі мовы. Абазначэнне гукаў літарамі

**15.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як «працуе» ў мове гук, а як — літара.






Словы складаюцца з гукаў мовы. Гукі мы чуем і вымаўляем: [м’], [і], [р].

Гукі на пісьме абазначаюцца літарамі. Літары мы бачым, пішам, чытаем: ***м, і, р***.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**16.** Разгледзьце малюнкі. Што вы на іх бачыце?

    

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце іх парамі. Падкрэсліце літары, якімі яны адрозніваюцца.

**17.** Прачытайце верш. Якога слова ў ім не хапае? Які малюнак намаляваў Дзіма?

***Радзі́ма***

## Малюнак

Аблачынка, сонца круг,  
а пад імі — рэчка, луг.  
І паставіў подпіс Дзіма:  
«Гэта ўсё — мая ... !»

*Р. Баравікова.*

Расшыфруйце піктаграмы. Які сказ атрымаўся? Дапоўніце яго патрэбным словам. Запішыце сказ.

, , ,  — гэта мая ... .



Спампавана з сайта www.aversev.by

Знайдзіце ў тэксце словы, якія адпавядаюць схемам.



Вымавіце іх. Ці супадаюць вымаўленне і напісанне слоў?



**Гук не заўсёды абазначаецца адпаведнай літарай. Напрыклад, чуем [лух], а пішам *луг*. Уважліва правярайце напісанае.**

**18.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце яго патрэбнымі словамі. Які настрой выклікаў у вас гэты тэкст? Чаму? Які яшчэ малюнак можна намаляваць да тэксту?

## Родныя мясціны



Шмат птушак жыве на ... землях. З надыходам восені некаторыя з іх разлуча́юцца з мілымі сэрцу краяві́дамі*. Вось у небе робіць ... круг жураўліная сям'я. Доўга чуваць ... спеў шпака. Няма нічога даражэйшага за Радзіму!



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Словы для даведкі:** *развітальны, самотны, беларускіх.*

Спішыце апошні сказ. Падлічыце колькасць гукаў і літар у апошнім слове.

**19.** З літар у дужках складзіце словы. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Кожнай *(штцыпу)* сваё *(одзняг)* патрэбна.



Запішыце прыказку.

**20.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках. Якія гукі вы вымаўлялі на месцы пропускаў у словах? Якімі літарамі іх трэба абазначыць?




со..




р..ка




б..к




в..да



Спампавана з сайта www.aversev.by

 

 

..ара | ..ак

Запішыце дзве пары слоў на выбар. Падкрэсліце літары, якімі яны адрозніваюцца.

**21.** Змяніце адзін гук у словах. Назавіце новыя словы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **дым** | **бітон** | **пень** | **гук** |
| [о] | [у] | [ц’] | [б] |
| | [а] | [дз’] | [л] |

Які гук на пісьме перадаецца дзвюма літарамі? Назавіце слова з гэтым гукам. Запішыце тры словы на выбар.

**22.** Расстаўце літары ***л*** і ***с*** у словах. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

   

А..е..я і А..і..а бачы..і ..і..у ў ..е..е.

Якія словы ў скорагаворцы запісаны з вялікай літары? Чаму?

Спішыце скорагаворку. Зрабіце ўзаемаправерку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**23.** З літар на малюнках складзіце словы. Дапоўніце імі народную прымету.




1




2

**Калі шмат (1), а (2) няма, зіма будзе суровай і снежнай.**

Запішыце народную прымету. Падкрэсліце словы, у якім колькасць гукаў і літар не супадае.

## Алфавіт

Маці мясіла цеста на піражкі. Яна паклікала Чамучыка:

— Сынок! Вазьмі мой тэлефон і набяры тату. Няхай купіць малака.

Прайшоў некаторы час. Але размовы Чамучыка з татам маці не пачула.

— Ай, мама! У цябе столькі кантактаў, ніяк не магу знайсці тэлефон таты.

Што трэба ведаць, каб хутка знайсці кантакт у тэлефоне?

Што такое алфавіт? Чаму яго трэба ведаць?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**24.** Прачытайце назвы літар беларускага алфавіта (гл. форзац 1). Колькі ўсяго літар у алфавіце?

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, для чаго трэба ведаць алфавіт.











**Усе літары, размешчаныя ў пэўным парадку, складаюць алфаві́т, або а́збуку. У беларускім алфавіце 32 літары. Парадак размеркавання літар называецца алфаві́тным. У алфавітным парадку стаяць кнігі ў бібліятэках, размяшчаюцца словы ў слоўніках.**

**25.** Запішыце ў алфавітным парадку літары з кожнага воблачка. Назавіце папярэднюю і наступную літары ў кожнай групе літар.

Е З І Ж Ё　　Р Т У С　　Ы Ш Э Ь

Л Й К М　　В Д Г Е　　Ч Ф Ц Х



Спампавана з сайта www.aversev.by

**26.** Паслухайце тэкст. Каму мы абавязаны з'яўленнем алфавіта? Прачытайце тэкст самастойна.

Славянскую азбуку называюць кіры́ліцай. Яе стварылі браты Кірыл і Мяфодзій. Жылі́ яны больш чым тысячу гадоў назад. Кірыл быў бібліятэкарам, выкладаў філасофію. Мяфодзій быў манахам. Браты выкарыстоўвалі кірыліцу пры перакладзе рэлігійных кніг з грэчаскай мовы на славянскую.

На аснове кірыліцы створаны алфавіты розных народаў: рускі, украінскі, балгарскі, сербскі. У аснову сучаснага беларускага алфавіта таксама пакладзена кірыліца. Літары алфавіта абазначаюць гукі мовы. Дзякуючы алфавіту мы можам чытаць і пісаць.

Што вы даведаліся пра братоў Кірыла і Мяфодзія? Раскажыце.

Якія алфавіты створаны на аснове кірыліцы? Запішыце іх назвы ў алфавітным парадку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**27.** Якія словы зашыфраваны? Запішыце іх.



Для вызначэння слова трэба ўзяць папярэднюю літару алфавіта.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| л | о | й | д | б | | |
| б | м | х | б | г | й | у |



Кожная лічба паказвае на парадкавы нумар літары алфавіта.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 9 | 2 | 21 | 12 | 1 |
| 13 | 10 | 20 | 1 | 18 | 1 |



**28.** Успомніце алфавіт. Назавіце прапушчаныя літары. Якое слова атрымалася з іх?

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| б | ? | г | д | е | ? | ё | ж | з | і |
| л | м | н | ? | п | л | м | ? | о | п |
| р | ? | т | у | ў | ц | ч | ш | ы | ? |

Запішыце «ланцужкі» літар і слова, якое атрымалася.



Спампавана з сайта www.aversev.by

# Вялікая літара



Чамучыку задалі́ вывучыць алфавіт. Ён прачытаў яго раз, другі і запытаў:

— Вось кажуць, што літар у алфавіце 32. На самай справе іх значна больш. Ёсць жа літары маленькія і вялікія! Называюцца аднолькава, а пісаць трэба па-рознаму. Для чаго патрэбны вялікія літары?

Калі пішацца вялікая літара ў словах?

**29.** Разгледзьце ўзоры вялікіх літар са старажытных кніг Францыска Скарыны. Раскажыце, што вы ведаеце пра старажытныя кнігі.



Пазнайце і назавіце літары, якія ёсць і ў сучасным беларускім алфавіце. Запішыце іх у алфавітным парадку. Вусна падбярыце словы, якія пачынаюцца з гэтых літар.



Спампавана з сайта www.aversev.by



З вялікай літары пішуцца:
- імёны, імёны па бацьку, прозвішчы: ***Анатоль Канстанцінавіч Клышка***;
- мянушкі жывёл: *кот* ***Барсік***;
- назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц: ***Рэспубліка Беларусь****, горад* ***Пінск***;
- назвы рэк, азёр, мораў: *рака* ***Прыпяць****,* *возера* ***Асвейскае****,* ***Ч****орнае мора*;
- першае слова ў сказе: ***В****учні пішуць сказ.*

**30.** Прачытайце тэкст. Аб чым вы даведаліся з яго? Сфармулюйце пытанні да кожнай часткі тэксту.

Ёсць недалёка ад Оршы маляўнічы куток. Гэта вёска Ляўкі.

Тут на дачы адпачываў народны паэт Беларусі Янка Купала. З першай сустрэчы паэт палюбіў гэты прыгожы край, яго добразычлівых людзей. На стварэнне вершаў яго натхнялі высокія сосны і сівы́ Днепр.




Спампавана з сайта www.aversev.by

Гасцямі паэта ў Ляўках былі беларускія пісьменнікі Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка. Цяпер тут музей. Каля будынка стаіць помнік паэту.

Назавіце словы, напісаныя з вялікай літары. Што яны абазначаюць? Выпішыце іх у наступнай паслядоўнасці: назва краіны, назва горада, назва ракі, назва вёскі, імя паэта.



**З маленькай літары пішуцца агульныя назвы сваякоў, жывёл, раслін, грыбоў:** ***тата, сініца, рамонак, баравік.***

**31.** Запішыце адказы на пытанні. Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.



Што знайшоў *(С/с)*ямён *(Б/б)*аравік на лясной паляне?



Каго намалявала *(А/а)*лена *(С/с)*арока?



Якія кветкі прынёс настаўніцы *(В/в)*асілёк?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Падкрэсліце вялікую літару ў словах. Знайдзіце кожную падкрэсленую літару ў алфавіце (гл. форзац 1). Назавіце тры літары пасля яе.

**32.** Прачытайце і запомніце скорагаворку. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах. Як размясціць імёны ў алфавітным парадку?

Марцін маркі разглядаў,
Максім рамкі абмяраў,
Раман мора маляваў,
а Макар час марнаваў.

*А. Котава.*

?
Марцін
Макар
Максім

Запішыце скорагаворку па памяці. Зрабіце ўзаемаправерку.

**33.** Прачытайце загадку-задачу. Вусна адкажыце на пытанне.

У *(Б/б)*абулі *(Я/я)*дзі — *(У/у)*нучка *(Д/д)*аша, *(К/к)*от *(С/с)*няжок, *(С/с)*абака *(Ж/ж)*учок. Колькі ўнукаў у бабулі?

Выберыце патрэбную літару ў дужках. Спішыце загадку-задачу. Падкрэсліце вялікую літару ў словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Знаёмства з арфаграфічным слоўнікам

**34.** Разгледзьце вокладкі кніг. Якая інфармацыя пра кнігі змешчана на іх. Як можна размеркаваць гэтыя кнігі па трох палі́цах?




У якой паслядоўнасці павінны стаяць кнігі на паліцах у бібліятэцы? Запішыце назвы кніг з паліцы са слоўнікамі. Раскажыце, для чаго патрэбны кожны слоўнік.



**Па арфаграфічным слоўніку можна праверыць напісанне слова.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**35.** Прачытайце і адгадайце загадку. Раскажыце, як вы хадзілі ў «гэты дом».

***бібліятэ́ка***

У нядзелю
ўсім са..ком
мы хадзілі
ў гэты дом.
Там,
у сонечных
святлі́цах*,
дрэмлюць
кні..кі на паліцах.
Кнігалю..,
казалі мне,
гэты дом
не абміне.

*У. Мацвеенка.*

Вымавіце словы з прапушчанымі літарамі. Які гук чуецца на месцы пропускаў? Праверце напісанне гэтых слоў па арфаграфічным слоўніку. Запішыце іх у алфавітным парадку. Назавіце слова з літарай, якая гука не абазначае.

**36.** Разгледзьце малюнак. Як называюцца элементы кнігі? Запішыце. Удакладняйце напісанне слоў па арфаграфічным слоўніку.






Спампавана з сайта www.aversev.by

**37.** Паслухайце тэкст. Чаму Нацыянальную бібліятэку Беларусі называюць дыяментам? Што нагадвае ўваход у бібліятэку? Як дастаўляюць кнігі чытачам?



**Нацыянальная** бібліятэка Беларусі знаходзіцца ў Мінску. Яна ўваходзіць у лік самых незвычайных у свеце. За арыгінальную форму яе называюць беларускім дыяме́нтам*. Вышыня будынка бібліятэкі складае 23 паверхі. **Уваход** нагадвае разгорнутую кнігу. У бібліятэцы захоўваюцца друкаваныя выданні, рукапісы, копіі дакументаў, **электронныя** і іншыя матэрыялы. Усяго іх каля 9 мільёнаў! У бібліятэцы працуе **тэлеліфт** (на фотаздымку). Ён дастаўляе кнігі чытачам у **кантэйнеры** па манарэйцы.

Спішыце першы сказ. У слоўнікавым слове пастаўце націск. Праверце напісанне выдзеленых слоў па арфаграфічным слоўніку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**38.** Складзіце з частак прыказкі і вымавіце іх. Чаму так гавораць?

| | |
|---|---|
| Хто шмат чытае, | ды вучыць, як жыць. |
| Кніга маўчыць, | той шмат ведае. |

Спішыце. Падкрэсліце літару, якая гука не абазначае.

## Галосныя гукі. Абазначэнне галосных гукаў на пісьме літарамі



Чамучык завіхаўся каля мале́нькай сястрычкі. Немаўля жаласліва плакала:

— Уа! Уа! Уа!

— Ну чаго ж ты галосіш, малеча! Мама неўзабаве прыйдзе! — суцяшаў дзіця Чамучык. Ён даў сястры бутэлечку малака, і дзяўчынка сцішылася.

— Цікавую рэч я заўважыў, — падумаў Чамучык. — Немаўляты яшчэ гаварыць не ўмеюць, а галосныя гукі ўжо ведаюць!

Якія галосныя гукі вымаўляла сястрычка Чамучыка?

Як вымаўляюцца галосныя гукі? Якімі літарамі яны абазначаюцца на пісьме?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**39.** Назавіце, што вы бачыце на малюнку. Якія гукі вымаўляюцца ў словах на месцы пропускаў? Якімі літарамі іх трэба абазначыць?

к_п_ст_
м_рков_
б_р_к



ц_б_л_
ф_с_л_
г_рб_з

Запішыце словы, устаўце патрэбныя літары. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.



**Галосных гукаў 6: [а], [о], [у], [э], [і], [ы]. Астатнія гукі зычныя. Галосныя гукі вымаўляюцца з удзелам голасу. Яны абазначаюцца 10 літарамі:**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| а | о | у | ы | э |
| я | ё | ю | і | е |

**40.** Выканайце заданне «Поле цудаў». Якія літары прапушчаны ў словах?



| | | | |
|---|---|---|---|
| т | в | ? | р |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| с | т | ? | л | ь |

**О?** **А?**

| | | | |
|---|---|---|---|
| м | ? | р | ? |



Спампавана з сайта www.aversev.by



| к | | т |
|---|---|---|

| б | | к |
|---|---|---|

| с | | н |
|---|---|---|

Запішыце словы. Вусна растлумачце іх значэнні.

**41.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся правільна іх вымаўляць. Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам.

Далі́ Даню дома дыню.
Сёння Сеня сушыць сена.
*А. Клышка.*

Выпішыце парамі словы, якія адрозніваюцца адной літарай. Падкрэсліце ў словах літары галосных гукаў.

**42.** Паслухайце тэкст. Пра якую пару года ў ім гаворыцца? Пералічыце прыметы, названыя ў тэксце. Якой пары года яны больш адпавядаюць?

У кастрычніку часам бывае добрае, сонечнае надвор'е. У паветры плывуць тонкія ніці павуцінак з мале́нькімі павучкамі.

На сінім небе — ні хмаркі. Лагодна свеціць сонца. **Зноў расцвітаюць некаторыя расліны. З'яўляецца зялёная траўка.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Лётаюць на сонцы матылькі.** У народзе гэтыя цудоўныя дні залатой восені называюць ба́біным летам.

Які загаловак адпавядае тэксту: «У кастрычніку», «Сонечнае надвор’е», «Бабіна лета»? Растлумачце.

Спішыце выдзеленыя сказы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі. У якіх словах падкрэсленыя літары абазначаюць два гукі? Зрабіце ўзаемаправерку.

**43.** Прачытайце верш. З чаго складаюцца словы?

Цагліна да цагліны —
і будзе новы дом.
А літара да літары —
і слова мы складзём.

**Радзіма, мова, мама,**
**кіно, буквар, балет.**
Вучы іх і таксама
адкрыеш дзіўны свет.

*М. Пазнякоў.*

Запішыце выдзеленыя словы ў алфавітным парадку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

## Абазначэнне літарамі *е, ё, ю, я, і* галосных гукаў і мяккасці зычных гукаў



Чамучык старанна выконваў заданне па беларускай мове.



Спампавана з сайта www.aversev.by

— Галосных гукаў 6: [а], [о], [у], [ы], [і], [э], — паўтараў ён.

— Пачакайце, — раптам усхапіўся хлопчык, — але ж я падкрэсліваў яшчэ ***е, я***... Не разумею!

Што пераблытаў Чамучык?

Чаму колькасць галосных гукаў і літар не супадае?

**44.** Утварыце пары са складоў. Прачытайце іх.

зу бя пы нё но ба зю пі гы гі

Запішыце склады, у якіх літара галоснага гука паказвае на мяккасць зычнага гука. Вусна падбярыце словы з такімі спалучэннямі літар.



**Літары *е, ё, ю, я, і* абазначаюць галосныя гукі [э], [о], [у], [а], [і] і паказваюць на мяккасць зычнага гука.**

[э] — э, е
[о] — о, ё
[у] — у, ю
[а] — а, я
[і] — і



Спампавана з сайта www.aversev.by

**45.** Дабаўце ў словы літары галосных гукаў. Якія літары паказваюць на тое, што зычны гук вымаўляецца мякка? Растлумачце значэнні слоў.




Запішыце словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме. Назавіце словы, якія адказваюць на пытанні: х т о? ш т о? я к і? ш т о р а б і ў?

**46.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў у словах?

Дзе кв..тка, там і м..д.
Дзіця да м..ці, як кра́ска* да с..нца.
Адна кв..тка вясн.. не роб..ць.

Спішыце прыказкі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.

**47.** Прачытайце тэкст. Які ўчынак здзейсніла хмарка? Ацаніце яго.

На небе жыла́ вясёлая хмарка. Раніцай яна гуляла ў даганялкі з іншымі хмаркамі. Ноччу плавала над рэчкай сінім туманам.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Вечарам спякотнага дня хмарка выпадкова зірнула на зямлю. Яна ўбачыла сумныя кветкі. Жалобна ні́клі яны ад смагі.

Хмарка заплакала ад спачування, і пайшоў цёплы дождж. Ён выратаваў расліны. Кветкі радасна ўзнялі́ галоўкі да неба.

Вусна сфармулюйце пытанні да кожнай часткі тэксту. Перакажыце адну частку на выбар.

Спішыце апошнюю частку тэксту. Падкрэсліце літары, якія паказваюць на мяккасць зычных гукаў.

**48.** Прачытайце верш Я. Жабко. Пра якую кветку ў ім гаворыцца?

*Як маленькі парасонік,*
*кветка белая стаіць.*
*Вочка жоўтае, як сонца,*
*у неба сіняе глядзіць.*

Спішыце. Падкрэсліце літары галосных гукаў, якія абазначаюць мяккасць зычных.





Спампавана з сайта www.aversev.by

## Абазначэнне літарамі *е, ё, ю, я, і* гукаў [й’э], [й’о], [й’у], [й’а], [й’і]



Чамучык быў вельмі ўзрадаваны. Бацькі́ набылі елку і пасадзілі побач з домам.

— Ура! Елка! Сапраўдная елка! — выгукнуў хлопчык. — На Новы год мы абавязкова ўпрыгожым яе.

Раптам Чамучык здзівіўся і задумаўся. У пачатку слова «елка» ён пачуў не адзін гук, а ... .

Калі літары ***е, ё, ю, я, і*** абазначаюць два гукі?

**49.** Вымавіце назвы прадметаў, якія паказаны на малюнках.

   

Параўнайце вымаўленне слоў з іх напісаннем. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары?

| Чуем і вымаўляем | Пішам |
|---|---|
| ба[й’а]н | *баян* |
| [й’о]рш | *ёрш* |
| вераб’[й’і] | *вераб’і* |
| каль[й’э] | *калье* |

Запішыце гэтыя словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by



Літары ***е, ё, ю, я, і*** абазначаюць два гукі:

- у пачатку слова: [й’э]хаць — *ехаць*;
- пасля галосных: чыта[й’у] — *чытаю*;
- пасля раздзяляльнага **ь**: кан[й’о]н — *каньён*;
- пасля апострафа: вераб[й’і] — *вераб’і*.

**50.** Прачытайце і дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.



Зубр, заяц, казуля, ... — гэта назвы ... .



Бузіна́, каліна, язмі́н*, ... — гэта назвы ... .



Рамонак, гладыёлус, наготкі, ... — гэта назвы ... .



Ястраб, дзяцел, стрыж, ... — гэта назвы ... .

Знайдзіце і запішыце словы, у якіх адна літара абазначае два гукі. Падкрэсліце гэтыя літары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**51.** Знайдзіце словы ў «чароўных» квадратах. Вымавіце іх. Якія літары ў гэтых словах абазначаюць два гукі? Запішыце словы.



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| я | р | а | с | т |
| с | х | в | о | я |
| е | д | н | ф | ы |
| н | ы | к | т | ж |
| ь | я | в | а | р |



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| н | л | я | н | о |
| я | г | а | в | т |
| ш | у | з | м | я |
| м | а | ю | е | я |
| ё | р | к | а | ё |

**52.** Прачытайце тэкст. Дзе можна ўбачыць самую высокую елку ў Беларусі?

Знайдзіце ў тэксце словы з літарамі ***ю***, ***я***, якія абазначаюць два гукі.

Беларусь — край лясоў. Яны займаюць трэцюю частку краіны. Лясы — наша багацце. Адзін з найбольш распаўсюджаных відаў дрэў на тэрыторыі Беларусі — прыгажуня елка. Самая знакамітая расце ў Белавежскай пушчы. Вышыня гэтага дрэва — 40 метраў, амаль з 12-павярховы дом! *(З кнігі «Мая Радзіма — Беларусь. Азбука сімвалаў краіны».)*

Запішыце пад дыктоўку першыя два сказы. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць два гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**53.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

**Ласка́вае слоўка, як сонейка, грэе.**

Якія гукі абазначае літара ***е*** ў словах? Спішыце прыказку. Падкрэсліце літару ***е***, якая абазначае два гукі.

**54.** Прачытайце скорагаворку. Пра якія кветкі ў ёй гаворыцца?

**Над возерам вецер лятае,**
**на хвалях ліле́і люляе.**
***М. Пазнякоў.***

Знайдзіце словы, у якіх літары ***е, і*** абазначаюць два гукі. Выпішыце іх. Падлічыце колькасць гукаў і літар у гэтых словах.

**55.** Прачытайце. Знайдзіце ў кожным радку лішняе слова. Растлумачце свой выбар.

**Яшчарка, зубраня, маяк, яма.**
**Юнга, каюта, малюнак, Юра.**

Выпішыце словы, у якіх літары ***я, ю*** абазначаюць два гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**56.** Прачытайце верш. Дакажыце, што ў ім гаворыцца аб пачатку восені. Пакажыце на малюнку «вочы» валошкі і «ву́сы» ячменю.



**Вочы** выцвілі ў валошкі,
**ву́сы** апусціў **ячмень;**
паніжэла **сонца** трошкі,
пацішэў яго **прамень.**

Ды цяпла пакуль хапае,
і святла яшчэ стае́*.
Поле людзям майго краю
ўсё багацце аддае.

*В. Жуковіч.*

Вызначце колькасць гукаў і літар у выдзеленых словах. Выпішыце з другой часткі верша словы, у якіх літары абазначаюць два гукі.

**57.** Прачытайце тэкст. Разгледзьце малюнак. Раскажыце, чым адметнае свята Дажынкі.

**Дажынкі — старажытнае свята ўраджаю.** Яно звязана з заканчэннем жніва. **У гэты дзень жнеі ўпрыгожвалі апошні сноп кветкамі і стужкамі.** Яны плялі вянкі



Спампавана з сайта www.aversev.by

з каласоў, палявых кветак. Потым з песнямі вярталіся ў вёску.



Жнеі перадавалі апошні сноп гаспадару. Ён запрашаў талаку́* за стол. **У кожнай сям'і на Дажынкі гатавалі шчодры пачастунак. На стол ставілі бліны з маслам, крупяную кашу.** Людзі спадзяваліся на добры ўраджай у наступным годзе.

Спішыце выдзеленыя сказы. Знайдзіце ў іх словы, дзе адна літара абазначае два гукі. Пазначце колькасць гукаў і літар над гэтымі словамі.



**58.** Прачытайце верш. Пра якую падзею ў ім гаворыцца?

У шчодрай, шчырай **восені** —  
багаты **ўраджай.**  
У восені — **запросіны:**  
**прыходзь** ці прыязджай.

*В. Жуковіч.*

Спішыце верш. Падкрэсліце слова з літарай, якая абазначае два гукі. У выдзеленых словах падкрэсліце літары галосных гукаў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Падзел слова на склады



Чамучык разам з бацькамі збіраў грыбы ў лесе. Раптам азірнуўся і не ўбачыў таты з мамай. Што рабіць?

— Ма-ма, ма-ма! Та-та, та-та! — пазваў хлопчык.

Бацькі хутка падышлі.

— Мама! Тата! Я напалохаўся! — сказаў пакрыўджаны хлопчык.

У якім выпадку Чамучык вымавіў словы *мама*, *тата* па складах?

Як даведацца, колькі ў слове складоў?

**59.** «Прайдзіце» па лесвіцы і прачытайце словы.




Запішыце словы па складах у два слупкі. Растлумачце свой выбар. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by



Склад слова ўтвараецца галосным гукам. Колькі ў слове галосных гукаў, столькі і складоў: *сон* (1 склад), *сястра* (2 склады), *жу-раў-лі* (3 склады).

**60.** Падбярыце да кожнага малюнка схему слова. Вызначце, колькі галосных гукаў і колькі складоў у словах. Вымавіце словы па складах.





Запішыце словы, падзяляючы іх на склады.



Звычайна склад заканчваецца на галосны гук (*ле-сві-ца*). Склад можа быць з адной літары, калі яна абазначае галосны гук (***ю**-шка, ка-**ю**-та, лі-ні-**я***).



Спампавана з сайта www.aversev.by

**61.** Прачытайце склады ў адпаведнасці з нумарацыяй. Вымавіце прыказку, якая атрымалася.

**1** ле **6** кор **4** зі **3** дзень

**5** му **7** міць **2** тні

Запішыце прыказку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Назавіце словы з двух складоў.

**62.** Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву? Разгледзьце малюнак. Што ў ім супярэчыць тэксту?

## Спазніліся

Пасля **дажджу** Аня з дзядулем **накіраваліся** ў лес па грыбы. У **густым** бары яны натрапілі на палянку **баравікоў**. Грыбы



былі яшчэ маленькія. Дзядуля прапанаваў пакінуць іх. Падрастуць яшчэ!

На наступны дзень Аня з дзядулем прыйшлі на палянку. Што яны ўбачылі? Над баравікамі шчыравалі



Спампавана з сайта www.aversev.by

**жвавыя** вавёркі. Побач на галінках **дрэва** былі нанізаны грыбы. Вавёркі запасалі іх на зіму.

Дзядуля з унучкай **вырашылі** не турбаваць звяркоў. Яны з цікавасцю **глядзелі** на вавёрак.

Выдзеленыя словы падзяліце на склады і запішыце.

Перакажыце частку тэксту такім чынам, каб яна адпавядала малюнку.

**63.** Прачытайце. Якога звярка мае на ўвазе аўтар верша? З выдзеленых літар складзіце назву звярка.

### У грыбах



Хто сар**в**аў мой грыбо**к**?
Пышнах**в**осты звя**р**ок.
Мне **ё**н хвосцікам махнуў
і н**а** дрэва сіг**а**нуў.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце першы сказ. Над словамі лічбамі пазначце колькасць складоў у іх.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**64.** Прачытайце верш. Назвы якіх грыбоў у ім сустрэліся? Колькі складоў у гэтых словах?

## Грыбнік

— Дзе ты быў, скажы, Алесь?
— Па грыбы хадзіў я ў лес.
— Што ж ты не набраў грыбоў:
маслякоў, баравікоў?
Памаўчаў Алесь з хвіліну...
— Я вавёркам іх пакінуў.

*А. Дзеружынскі.*

Паміж кім магла адбыцца такая размова? Прачытайце верш па ролях. Раскажыце, як вы збіралі грыбы. Якія правілы збору грыбоў трэба выконваць?

Спішыце адказы Алеся, падзяляючы словы на склады. Падкрэсліце літары галосных гукаў у двух- і трохскладовых словах.

**65.** Прачытайце. Якіх слоў не хапае ў кожным радку? Колькі ў словах складоў?



| | | | |
|---|---|---|---|
| лес | сад | грыб | |
| лясок | садок | ... | ... |
| ляснік | ... | ... | ... |

Запішыце словы, якія дадалі. Падзяліце іх на склады падчас запісу.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**66.** Прачытайце словы першага радка. Падзяліце іх на склады. Колькі ў кожным слове складоў?

| бульба | гайка | крэйда | журавель |
| --- | --- | --- | --- |
| ↓ | ↓ | ↓ | ↓ |
| ба □ ка | ра □ | брыга □ | □ кета |

З кожнага слова першага радка выдзеліце склад, які трэба дадаць у словы другога радка. Запішыце па складах словы, якія атрымаліся. Падкрэсліце літары галосных гукаў.

Вусна падбярыце да кожнага слова іншыя словы, якія адказваюць на пытанне *я к а я*?

**67.** Прачытайце пачатак тэксту. Раскажыце па малюнках, што адбывалася далей. Чаму тэкст мае такую назву? Што на самай справе трэба рабіць, каб знайсці грыбы? У адносінах да каго трэба быць ветлівым?

## Ветлівасць

Восеньскім поўднем выбраўся Міколка з дзядзькам у грыбы. Прывабіў іх бярозавы гаёк, што знаходзіўся кіламетры за два ад чыгункі.



Спампавана з сайта www.aversev.by




Выпішыце з тэксту па адным прыкладзе двух-, трох- і чатырохскладовых слоў. Падзяліце іх на склады.

**68.** Прачытайце. Дапоўніце сказ патрэбным словам.



Лісічкі, рыжыкі, махавікі,
баравікі, зялёнкі, масля́кі —
адкажа, пэўна, з вас любы́,
што гэта ўсё — ... .

*С. Шах.*

Знайдзіце на малюнках названыя ў вершы грыбы. Запішыце іх назвы ў алфавітным парадку, падзяляючы рыскамі на склады.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Падзел слова для пераносу



Чамучык падпісваў віншавальную паштоўку сваёй бабулі:




Хлопчык расхваляваўся. Пажаданне здароўя не змяшчалася ў радок. Што рабіць?

Як перанесці слова з аднаго радка на другі?

**69.** Разгледзьце малюнкі кветак. Прачытайце іх назвы. Прачытайце верш. Дзе можна ўбачыць гэтыя расліны?

Колькі кветак ля ракі!
Сінія, як вочкі,
незабудкі і браткі,
смолкі і званочкі.



Спампавана з сайта www.aversev.by



бра́ткі

I мядунка, і герань,
слёзкі, мята, кашка!
Сто букетаў назбіраць
тут за дзень няцяжка.

*Н. Гілевіч.*



герань



мядунка



мята



кашка



слёзкі



смолкі

Выпішыце з верша назвы кветак у тры слупкі па схемах. Падзяліце словы на склады.





Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах: *ба-бу-ля*.

Некалькі зычных у сярэдзіне слова пры пераносе можна раздзяліць, а можна перанесці разам: *ся-стра*, *сяс-тра*, *сяст-ра*, *дзё-ннік*, *дзён-нік*.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**70.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Сад **садоўнік** даглядае,
дрэвы, **кветкі** палівае.
Карані **вадзіцу** п’юць.
Як садоўніка завуць?
*М. Пазнякоў.*




Назавіце словы, якія складаюцца з аднаго склада. Як іх перанесці з аднаго радка на другі?

Назавіце словы, якія маюць склад з адной літары. Як перанесці такія словы?

Запішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу.

***дождж***



## Пры пераносе НЕЛЬГА:

- пакідаць на радку ці пераносіць на новы радок **склад з адной літары:** *ана-нас, зда-роўе*;



- адрываць ***й, ў, ь, апостраф (’)*** ад папярэдняй літары: *чай-ка, лаў-ка, ляль-ка, аб’-езд*;





Спампавана з сайта www.aversev.by

- раздзяляць спалучэнні літар ***дз, дж***, якія абазначаюць гукі [дз’], [дж]: ***ты-дзень, дож-джык.***




**71.** Прачытайце.



Запішыце словы, падзяляючы для пераносу. Якімі правіламі вы карысталіся? Якія словы нельга падзяліць для пераносу?

Альбом, сойка, каўнер, акунь, студзень, мядзведзь, шчаўе.



Размяркуйце словы па трох слупках згодна з правіламі пераносу, што пададзены ў рубрыцы вышэй. Запішыце іх, падзяляючы для пераносу. Якія словы можна пераносіць рознымі спосабамі?

Медальны, Радзіма, ураджай, падзея, гадзіннік, рыдлёўка, сонейка.

**72.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх патрэбнымі словамі.

Вялікі ... — гэта лівень.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Маленькі дождж — гэта ... .

Плашч з непрамака́льнага матэрыялу для засцярогі ад дажджу — гэта ... .

Словы для даведкі: *дажджавік*, *дожджык*, *дождж*.

Спішыце другі сказ, падзяляючы словы для пераносу. Якое слова нельга падзяліць для пераносу? Чаму?

**73.** Прачытайце тэкст.

**Восенню надвор'е** пагоршылася. Неба стала шэрым. Сонца свеціць не так ярка. Амаль кожны дзень ідуць **дажджы.**

Спішыце першы і апошні сказы. Выдзеленыя словы падзяліце для пераносу.

У апошнім сказе знайдзіце словы, якія нельга падзяліць для пераносу. Растлумачце свой выбар.

**74.** Прачытайце верш. Што адбываецца, калі «плачуць» хмаркі?

Хмаркі дожджыкам заплачуць —
па зямлі дажджынкі скачуць.



Спампавана з сайта www.aversev.by

А ў траве гарацць расінкі —
сонца яркія іскрынкі.

*В. Кажура.*

Спішыце верш, падзяляючы для пераносу апошняе слова кожнага радка. Падкрэсліце ў гэтых словах літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

**75.** На кожным малюнку знайдзіце правільны варыянт падзелу слова для пераносу. Растлумачце свой выбар.




Запішыце словы, правільна падзяляючы іх для пераносу. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

**76.** Прачытайце. На якія групы можна падзяліць словы кожнага радка?

1. А-лень, ін-дык, а-ве-чка, змя-я.
2. Ва-вёрка, жыра-фа, кра-кадзіл, ка-зуля.



Спампавана з сайта www.aversev.by

У якім радку ўсе словы падзелены для пераносу? Спішыце гэтыя словы, падзяляючы іх для пераносу іншым спосабам.

**77.** Прачытайце народныя прыметы. Назвы якіх пор года прапушчаны? Растлумачце свой адказ.

Шмат ягад улетку — на халодную з _ _ _.
У лесе шмат рабіны — в _ _ _ _ _ будзе дажджлівая, мала — сухая.

Знайдзіце словы, якія маюць склад з адной літары. Якія з іх можна падзяліць для пераносу? Запішыце гэтыя словы, падзяляючы для пераносу. Над словамі пазначце колькасць складоў.

**78.** Прачытайце тэкст. Перастаўце склады і назавіце выдзеленыя словы правільна. Прыдумайце пытанні да кожнага сказа.

У Надзейкі дзень **нняранаджэ**. Да яе прыйшлі **кіброўся**. Яны падарылі дзяўчынцы **нікслоў**.

Спішыце тэкст, падзяляючы выдзеленыя словы для пераносу.

Раскажыце, як вы віншуеце сваіх сяброў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**79.** Прачытайце верш. Што падарылі хлопчыку?

Імяніны — гэта свята.
Надарылі мне багата:
маці — мяч футбольны, майку,
брат — пенал,
сястрычка — зайку.
Тата мой пасля работы
мне купіў у краме боты.

*У. Мацвеенка.*







Запішыце словы, якія адпавядаюць малюнкам. Падзяліце іх для пераносу. Якое слова нельга падзяліць для пераносу? Чаму?

## Націск



— ЧаМУчык! — паклікала маці. — Ты зрабіў урокі?

— Не ўсе яшчэ, — адказаў хлопчык.



Спампавана з сайта www.aversev.by

— ЧаМУчык! Я вельмі прашу цябе да вячэры ўсё зрабіць, — загадала маці.

Які склад у імені хлопчыка маці вымавіла мацней за іншыя? Як называецца вылучэнне склада ў слове сілай голасу?

Які склад у слове з’яўляецца націскным? Як вызначыць націск у слове?

**80.** Састаўце словы са складоў, запішыце іх. Назавіце літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Падкрэсліце ў словах склад, які вымаўляецца мацней за іншыя.




ва, тра, дрэ




лі, ма, ны, мо




ба, вік, ра, вяр




ра, сон, па, ца



Спампавана з сайта www.aversev.by



**Націск** — гэта выдзяленне голасам аднаго са складоў у слове. Склад, які вымаўляецца ў слове мацней за іншыя, называецца **націскным:** *кама́р, авадзе́нь*. Усе астатнія склады ў слове — **ненаціскныя.** Знак націску ставіцца над літарай, якая абазначае галосны гук у націскным складзе: *мура́ш, пчала́*.

**81.** Прачытайце верш. Што выклікала ў вас усмешку? Вызначце націскныя склады ў словах.

*свя́та*

### Рыбак

Наш **Максім рыбак** заўзяты,
печкуроў лавіць **ама́тар***.
Для яго **рыбалка** — **свята**:
чарвякоў капае... **тата**.

*А. Пісьмянкоў.*

Запішыце выдзеленыя словы ў два слупкі ў залежнасці ад месца націску. Пастаўце націск у словах.



Знак націску не ставіцца над словам з аднаго склада і над літарай *ё*.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**82.** Прачытайце тэкст. Аб чым расказваецца ў кожнай яго частцы? Перакажыце частку тэксту, якая адпавядае малюнку.



Лятучыя рыбы жывуць у ц..плых морах. Яны маюць вельмі вялікія грудныя плаўнікі, падобныя на крылы. «Рухавіком» у лятучых рыб служыць хвост.

Лятучая рыба перад пал..там падымаецца ў верхнія слаі вады. Яна хутка плыве па паверхні. З такой жа хуткасцю рухаецца кур'ерскі цягнік. Праз некаторы час рыба падымаецца ў паветра. Пал..т доўжыцца каля хвіліны. Пасля рыба павольна, як на парашуце, апускаецца ў ваду. *(З кнігі «Таямніцы дзеда Усяведа».)*

У якіх словах у тэксце не трэба ставіць націск? Чаму?

Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце націскны склад у гэтых словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**83.** Прачытайце парамі словы, запісаныя па-руску і па-беларуску. Правільна выдзяляйце голасам націскныя склады. Чым адрозніваецца вымаўленне слоў у рускай і беларускай мовах?

| | | | |
|---|---|---|---|
| решето́ | рэ́шата | ве́рба | вярба́ |
| щаве́ль | шча́ўе | до́чка | дачка́ |
| спина́ | спі́на | реме́нь | рэ́мень |

Запішыце словы на беларускай мове ў алфавітным парадку. Пастаўце націск.

Вусна да кожнага слова падбярыце па сэнсе слова, якое адказвае на пытанне я к і? (я к а я? я к о е?).

**84.** Прачытайце верш. Назавіце слова, якое адрозніваецца месцам націску ў беларускай і рускай мовах.



### Крапіва

**Крапіва́**, крапіва —
ты **пякучая** трава.
Ты, такая злючка,
**апякла** мне ручкі.
Гэта **непарадак**,
вырву цябе з **градак**.

*А. Дзеружынскі.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

Запішыце выдзеленыя словы. Падзяліце іх на склады рыскамі, пастаўце націск. Назавіце першы пераднаціскны склад. У якім слове яго няма?

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, чым карысная крапіва.

**85.** Прачытайце словы. Вызначце ў іх націскныя склады.

**Пацеркі, маліны, канапа, ... .**
**Мішка, шпакі, пліта, ... .**

Складзіце з націскных складоў прапанаваных слоў новае слова. Запішыце ўсе словы. Пастаўце націск.



Маці даслала Чамучыку СМС-паведамленне:

> Сынок, паглядзі, колькі сала ў кашы.
> Напішы мне.

Чамучык паглядзеў на стол і разгубіўся.





Як вы думаеце чаму? Што не ўлічыла маці, калі набірала СМС-паведамленне?

Як месца націску ўплывае на значэнне слова?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**86.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках.

   

На які склад падае націск у словах?

Вусна складзіце сказы з гэтымі словамі. Запішыце сказ са словам *касá*.

**87.** Прачытайце спалучэнні слоў.

Вару **кашу** — **кашу** траву, **плачу** за праезд — **плачу** ад болю, старажытныя **замкі** — дзвярныя **замкі**.

Спішыце. Пастаўце націск у выдзеленых словах, падкрэсліце ненаціскныя склады.



**Падчас чытання захоўвайце націск на *о, э*.**

**88.** Прачытайце, правільна вымаўляючы словы з ***о, э***. Пра што новае вы даведаліся з тэксту?



Спампавана з сайта www.aversev.by



Гэту рэч не сустрэнеш у сучасных кватэрах. Пагледзіце на куфар. Вялікая размаляваная скрыня. У ёй захоўвалі розныя рэчы і ежу. Раней мэблі ў хатах было няшмат. Куфар выконваў ролю стала, ложка, лаўкі, шафы. Часам у яго складвалі самае дарагое. Каштавалі куфры прыблізна як карова ці конь. *(З кнігі «Дзіцячы атлас Беларусі».)*

Выпішыце з тэксту назвы мэблі ў алфавітным парадку. Пастаўце ў словах націск.

**89.** Прачытайце. Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы?



Ставім **вазы** на **вазы**.
Адвязём за два разы.



Верабей ад **страху**
схаваўся пад **страху**.



**Ракі** выпаўзлі з **ракі**.
*Н. Сторажава.*

Спішыце. Пастаўце націск у выдзеленых словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Правапіс літар *о, э — а*



— Падабаецца мне беларуская мова! — падумаў Чамучык. — Усе галосныя гукі вымаўляюцца выразна і перадаюцца на пісьме адпаведнымі літарамі. А два галосныя гукі нават падкажуць, куды падае націск у слове. Вось толькі якія гэта гукі? Якімі літарамі яны перадаюцца на пісьме?

Якія галосныя гукі ў беларускай мове вымаўляюцца толькі пад націскам?

**90.** Вымавіце словы, вылучаючы голасам націскныя склады. Назавіце галосныя гукі, якія вы вымаўлялі ў націскных складах. Якімі літарамі іх трэба абазначыць?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| м | О | ра | р | Э | кі |
| г | | рад | с | | рца |
| с | | сны | др | | ва |
| ст | | г | ц | | ны |

Якія літары пішуцца толькі пад націскам? Запішыце словы. Пастаўце ў іх націск.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**У беларускай мове гукі [о], [э] вымаўляюцца толькі пад націскам.**
**На пісьме яны абазначаюцца літарамі *о, э*: *жо́луд, чарэ́шня*.**

**91.** Знайдзіце назву кожнага прадмета. Запішыце словы. Пастаўце націск.



відэлец

цэгла

коўдра

насоўка

бавоўна

**92.** Прачытайце словы. Які галосны гук вымаўляецца ў кожным слове пад націскам, не пад націскам?

Камар, Піліп, кукуруза, цяля, малюю, машыны.

Запішыце двухскладовыя словы. Падкрэсліце націскныя склады.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**93.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі, складзенымі з літар у дужках. Размясціце часткі тэксту ў правільнай паслядоўнасці. Аб чым ідзе гаворка ў кожнай частцы? Перакажыце тэкст.

## Антонаўкі

На яблынях трымаліся апошнія *(а, д, ы, п, л)*. Толькі на антонаўцы не было прымет восені.

Антонаўкі захоўваюцца вельмі *(ў, г, а, д, о)*. Цаніць смак гэтых яблыкаў пачынаеш *(м, й, о, з, і)*.

Наступіла *(н, о, в, ь, е, с)*. Пачало ападаць пажоўклае лісце.

Выразна вымавіце словы з гукам [о]. Вызначце націскны склад.

Запішыце пад дыктоўку сказы са словамі, састаўленымі з літар. Падкрэсліце ў іх націскны склад. Зрабіце ўзаемаправерку.

**94.** Прачытайце і адгадайце загадку.

У вяч..́рняй сіняве
залаты чаўн..́к плыве.



Спампавана з сайта www.aversev.by



С.́.нца глянула —
ён знік,
бо чаўн.́.к той — … . *(М..л..дзі́к.)*
*М. Чарняўскі.*

Спішыце словы з прапушчанымі літарамі. Растлумачце іх правапіс.

**95.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

*Сёння зр.́.біш — заўтра як зн.́.йдзеш.*

Спішыце. Устаўце прапушчаныя літары.



У магазіне ўзрадаваны Чамучык прачытаў аб’яву «Цэны зніжаны» і пацягнуў маму ў аддзел цацак. Яны пачалі вывучаць асартымент машынак. Хлопчык зрабіў выбар і паказаў матулі. Яна запыталася:

— Якая цана ў гэтай машынкі?

Чамучык задумаўся: «Мама сказала “ц**а**на́”, а ў аб’яве было “ц**э́**ны”. Чаму?»

Што адбываецца з гукамі [о], [э] не пад націскам?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**96.** Аб’яднайце словы ў пары. Параўнайце іх вымаўленне. Назавіце словы з націскнымі [о], [э]. Які гук вымаўляецца не пад націскам на месцы [о], [э]? Якой літарай ён абазначаны?

голас драўляны марскі
страха мора галасы
дрэва стрэхі

Запішыце пары слоў. Пастаўце націск.



**У ненаціскных складах на месцы гукаў [о], [э] вымаўляецца гук [а] і пішацца літара *а*: *но́гі — нага́, шэ́пт — шапта́ць*.**

**97.** Прачытайце словы. Які гук вымаўляецца ў першым складзе кожнага слова? Якой літарай яго трэба абазначыць?

г●́ры р●́кі в●́ды ц●́ны

Змяніце словы так, каб яны называлі адзін прадмет. Які гук вымаўляецца на месцы [о], [э] не пад націскам? Запішыце гэтыя словы. Падкрэсліце літару, якая пішацца на месцы ***о, э*** не пад націскам.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**98.** З апорай на схему раскажыце, як вызначыць, якую літару (***о, э*** ці ***а***) трэба напісаць у слове.

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю націск.

| Пад націскам пішу ***о, э***. | Не пад націскам на месцы ***о, э*** пішу ***а***. |
|---|---|

Карыстаючыся схемай, раскажыце, як вызначыць, якую літару трэба запісаць у словах *г..рад, г..рады, ц..гла, ц..гляны*.

**99.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках. Які гук вымаўляецца пад націскам? Які гук вымаўляецца на месцы [о], [э] не пад націскам?



Запішыце адну пару слоў на выбар.

 — 

 — 



Як вы думаеце, якія малюнкі павінны быць на месцы пытальнікаў? Запішыце адпаведныя словы.

 — ?

 — ?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**100.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце і дапоўніце тэкст патрэбнымі словамі.




На канікулах мы хадзілі ў паход. Спачатку ішлі ўздоўж пасялковай ... (1). Потым — па ўзмежку жытнёвага ... (2). Мы з задавальненнем выцягвалі рукі, дакраналіся далонямі да спелых ... (3). Нарэшце мы прыйшлі да ... (4). Праз яе перакінуты драўляны ... (5). Ад яго было недалёка да лясной ... (6). Там мы спыніліся адпачыць. А вы хадзілі ў паход?

Запішыце словы, якімі дапоўнілі тэкст. Растлумачце іх правапіс.

**101.** Прачытайце словы. Вызначце націскныя склады. Якія літары — ***о***, ***э*** ці ***а*** — трэба ўставіць у словы?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Р..чка, р..ка, р..чны.
Мар..з, мар..зы́, мар..зны.

Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

**102.** Дапоўніце кожнае спалучэнне слоў патрэбным словам.

Высокая , глыбокая , вострая , прыгожыя , доўгія .

Запішыце спалучэнні слоў. Пастаўце націск.

**103.** Знайдзіце пары слоў. Па якой прымеце вы іх аб'ядналі? Якія словы засталіся без пары?

шэпт    пч..ла    рэцэпт
ш..ўковы    тр..шчаць    к..за
козы    пчолы
ш..птаць    стог    трэск
шоўк    інтэрнэт    ст..гі

Запішыце словы з прапушчанымі літарамі.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**У некаторых словах, якія прыйшлі ў нашу мову з іншых моў, літара *э* пішацца не пад націскам. Напрыклад: *гардэро́б, тэлефо́н, рэспу́бліка, энцыклапе́дыя*. Іх напісанне трэба правяраць па арфаграфічным слоўніку.**

**104.** Прачытайце словы. Удакладніце іх напісанне па арфаграфічным слоўніку.

Р..клама, вет..ран, а..рапорт, орд..н, ..кскурсія, т..левізар.

***экску́рсія***

Запішыце словы ў алфавітным парадку. Пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце ўстаўленыя літары.

У якія групы можна аб’яднаць словы? Прыдумайце тэкст, выкарыстоўваючы словы адной з груп.

**105.** Уявіце, што вы ўдзельнічаеце ў распрацоўцы рэкламнага буклета. Дапоўніце яго патрэбнымі словамі.

Словы для даведкі: *экскурсіі, сябры, падарожнічаць*.



Спампавана з сайта www.aversev.by




Спішыце апошні сказ. Пастаўце націск у слоўнікавым слове. У першым пераднаціскным складзе падкрэсліце літару галоснага гука.

Куды запрашае падарожнікаў буклет? Раскажыце, як пра гэта можна напісаць у буклеце.

**106.** Прачытайце тэкст. Пра што новае вы даведаліся?

Нарач — самае вялікае возера ў нашай краіне. Гэта возера называюць беларускім морам, жамчужынай Беларусі. Вада ў Нарачы празрыстая. У водах возера водзіцца шмат відаў рыб, а таксама рэдкія вадаплаўныя птушкі. Бераг Нарачы вартуюць сосны.

Знайдзіце ў тэксце словы з літарай ***о***. Змяніце іх так, каб на месцы ***о*** пісалася ***а***. Запішыце гэтыя словы парамі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**107.** Прачытайце верш.

### Зямля м..я

**Зямля м..я ..зёрная —**
**рабіна за ..кном,**
**крынічка ціхам..ўная,**
**г..сцінны светлы д..м.**
*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс.

Вымавіце па парадку гукі і назавіце літары ў выдзеленым слове.

## Правапіс літар *е, ё — я*



— Бабулечка, давай пагуляем у перакладчыка, — прапанаваў Чамучык.

— Давай! Пачынай! — пагадзілася бабуля.

Чамучык паглядзеў у акно і запісаў словы паруску: снежинка, темнеть, зелёный, сестра. Бабуля пераклала іх на беларускую мову: сняжынка, цямнець, зялёны, сястра.

— Цікава, бабулечка! У беларускай мове замест ***е*** трэба пісаць ***я***?

Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**108.** Прачытайце словы. Змяніце іх па ўзоры. Параўнайце вымаўленне слоў. Якія галосныя гукі вымаўляюцца ў націскных складах у першых словах кожнай пары? У другіх словах кожнай пары вызначце націск і першы склад перад націскам.

звер — звяры　　　сёлы — сяло
лес — ...　　　плечы — ...
снег — ...　　　вёдры — ...

Запішыце пары слоў. Падкрэсліце літару, якая пішацца замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам.



У беларускай мове ў першым складзе перад націскам замест літар ***е, ё*** пішацца ***я***: *лес — лясны́, лёд — лядо́к*. Ва ўсіх іншых ненаціскных складах пішацца ***е***: *ле-са-ві́к, ле-дзя-ны́, во́-зе-ра*.

**109.** Прачытайце сказы. Выразна вымавіце словы, у якіх прапушчаны літары. Выпішыце іх парамі. Пастаўце ў гэтых словах націск, падкрэсліце першы склад перад націскам.

Узор: *кве́ткі — <u>квя</u>ці́сты*.


Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Летам на лузе шмат прыгожых кв..так. Над кв..цістым лугам лятaлі пчолы.

2. Дз..ці спяшаліся ў школу. Маці паклікала дз..цей дадому.

3. Надыходзіў халодны зімовы в..чар. В..чэрні змрок апускаўся на зямлю.

4. Восенню птушкі пакіда́юць свае гн..зды. Гн..здо бусла называецца бусля́нкай.

**110.** Прачытайце. Пра якую з’яву гаворыцца ў вершы? Калі яе можна заўважыць? Які настрой яна выклікае?

## У вырай

У вырай л..цяць жураўлі,
далёка ад роднай з..млі.
Я з птушак не зводжу в..чэй:
— Д..моў прыл..тайце хутчэй!

*Н. Галіноўская.*

Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

Запішыце пад дыктоўку першы сказ. Пастаўце ў словах націск, падкрэсліце першы склад перад націскам.

**111.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, чаму восеньскія месяцы маюць такія назвы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

У верасні цвіце верас. Адсюль і назва месяца. Адлятаюць у вырай птушкі, наспяваюць журавіны. Пушны́я звяры мяняюць сваё футра.



Назва месяца «кастрычнік» паходзіць ад слова «кастры́ца». У гэты час нашы продкі трапалі лён. З яго ляцела шмат кастрыцы.



Апошні месяц восені — лістапад. Чаму яго так назвалі? Паспрабуйце адказаць.

**ме́сяц**

Выпішыце словы з ***я*** ў першым складзе перад націскам. Растлумачце іх напісанне.

Дапоўніце сказ патрэбнымі словамі. Запішыце яго. Пастаўце ў словах націск.

…, …, … — восеньскія месяцы.

**112.** Прачытайце прыказку. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

*Кожная птушка сваё гн..здо в..дае.*

Спішыце. Пастаўце ў словах націск.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**113.** Паслухайце верш.

Перад націскам у першым складзе
***я*** замест ***е, ё*** выводзіць Надзя.
Піша: лес — лясны, мёд— мядовы...
Вы запомніць правіла гатовы?

*А. Зэкаў.*

Пра якое правіла гаворыцца ў вершы? Знайдзіце словы на гэта правіла. Выпішыце словы парамі. Растлумачце іх правапіс. Прывядзіце свае прыклады слоў.

**114.** Разгледзьце схему. Як вызначыць, якую літару — ***е, ё*** ці ***я*** — трэба пісаць у слове?

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю націскны склад.

| У націскным складзе | У 1-м складзе перад націскам | У іншых ненаціскных складах |
|---|---|---|
| пішу ***е, ё*** | замест ***е, ё*** пішу ***я*** | пішу ***е*** |



Спампавана з сайта www.aversev.by

Карыстаючыся схемай, раскажыце, як вызначыць, якія літары трэба напісаць у словах *сн..жок*, *з..л..наваты*, *сн..гір*, *в..с..ліць* на месцы пропускаў.

**115.** Прачытайце слупкі слоў. Замест малюнкаў называйце адпаведныя словы.

| | | |
|---|---|---|
| **снег** | **вецер** | **бег** |
| **снягі** | **вятры** | **бягуць** |
| **сн..гавы** | **в..ц..рок** | **праб..жка** |
|  |  |  |

Якая літара пішацца пад націскам у словах першага радка? Вызначце ў словах другога радка націск. Назавіце першы пераднаціскны склад. Растлумачце правапіс ***я***.


Запішыце словы трэцяга радка.


Запішыце словы чацвёртага радка.

Пастаўце ў словах націск. Падзяліце словы рыскамі на склады. Падкрэсліце першы пераднаціскны склад.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**116.** Прачытайце. Чаму звыклая дарога ў школу падалася Свеце незвычайнай? Раскажыце, як выглядае ваша дарога ў школу.

Раніцай ідзе Св..тлана ў школу з дз..дулем. Ідзе, як заўсёды, адной д..рогай. А д..рога гэта вядзе праз парк. Св..та ведае тут кожны куток, кожнае дрэва.

Сёння прайшла Св..тланка м..сток і не пазнала д..рогі. Нібы хто кв..цісты дыван разаслаў пад нагамі. На з..млі жоўтыя кружочкі, барво́выя* д..лонькі, ружовыя сэрцайкі. Іх становіцца ўсё больш і больш. Лісты павольна зл..таюць на дол.

Спынілася Св..тачка. Перад ёй л..жыць пяро́сты* дыван. Як жа ступіць на такое хараство?



Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

Выпішыце з другой часткі тэксту словы з літарамі ***ю, я***, якія абазначаюць два гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**117.** Прачытайце. Пра якія дываны́ расказвае аўтар верша? Раскажыце, што вы ўяўлялі, калі чыталі верш.

Завіруха з..л..тая
з дрэў ліст..ту абм..тае.
Рассцілае дываны,
дзе ні глянь —
л..жаць яны.

*М. Чарняўскі.*



Растлумачце, якія літары трэба ўставіць на месцы пропускаў у словы.

Спішыце. У словах першага сказа пастаўце націск.

**118.** Прачытайце. Якія літары прапушчаны ў словах?



..льнік ..лінка

..ловы ..лкі ..лачка

Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце ў іх націск. Падзяліце словы рыскамі на склады. Растлумачце правапіс.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**119.** Прачытайце словы. Чым яны адрозніваюцца? Да якіх малюнкаў адносяцца?



**лячыць**
**ці**
**лічыць**



Што будзе рабіць касір?

Што будзе рабіць урач?

Запішыце адказы на пытанні. Пастаўце націск у словах, якія адрозніваюцца адной літарай. Падкрэсліце ў іх літару галоснага гука ў першым пераднаціскным складзе.

**120.** Паслухайце верш. Чым былí заняты браты?

## Піла

З братам Янкам
да сн..данку
мы п..луем дровы
ўранку.

Хоць не ела,
не п..ла —
весела п..е
п..ла.

*П. Марціновіч.*

Вымавіце словы, у якіх прапушчаны літары. Якія гукі чуюцца на месцы пропускаў? Якой літарай іх трэба абазначыць? Запішыце гэтыя словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**121.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, як вырасціць агурок у бутэльцы.

## Агурок у бутэльцы

Мама Тамары працуе ў ц..пліцы. Там і з..мой цёпла. На вуліцы кружацца сн..жынкі і лютуе мароз. А ц..плічная машына з агароднінай едзе ў горад. У скрынках л..жаць чырвоныя пам..доры і доўгія агуркі.

Дз..ўчынка з мамай вырашылі вырасціць агурок у бутэльцы. Яны прац..гнулі ў рыльца бутэлькі сц..бло агурочніку з маленькай завяззю. Дз..ўчынка старанна даглядала свой агурок. Яна пал..вала яго, паварочвала да сонейка. Агурок вырас!

Тамара прынесла свой агурок у школу. Аднакласнікі здз..віліся:

— І як ён вырас такі в..лізны ў бутэльцы?

*(М. Даніленка.)*

Колькі частак у тэксце? Аб чым гаворыцца ў кожнай з іх?

Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце іх правапіс.

Запішыце пад дыктоўку першую частку тэксту. Зрабіце ўзаемаправерку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**122.** Прачытайце словы. Вызначце ў іх націск. Якія літары трэба ўставіць?

**Вёска — в..сачка, в..сковы.**
**Весела — в..сёлы, в..с..ліць.**
**Сіні — с..нець, с..нява.**

Спішыце. Устаўце ў словы прапушчаныя літары.

Чарга ў касу была невялікая. Мама папрасіла Чамучыка збегаць і ўзяць яшчэ бутэльку кефіру. Хлопчык хутка знайшоў патрэбную паліцу, працягнуў руку і... схамянуўся. На выхадзе з магазіна ён спытаў:

— Мама! На бутэльцы напісана «кефір». Аднак згодна з правілам у першым складзе перад націскам пішацца ***я***. Няўжо памылка?

У якіх словах у першым складзе перад націскам захоўваецца ***е***?

**123.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

***метро́***



У **метро** нас разам з братам
запрашае **эскала́тар.**

*М. Пазнякоў.*


Спампавана з сайта www.aversev.by

Назавіце галосныя гукі ў выдзеленых словах. Ці адпавядае напісанне слоў правілам, якія дзейнічаюць у беларускай мове? Запішыце скорагаворку пад дыктоўку. Зрабіце ўзаемаправерку.



**У некаторых словах, якія прыйшлі ў нашу мову з іншых моў, літара *е* пішацца ў першым складзе перад націскам: *пена́л, педа́ль, перо́н, апельсі́н, кефір, сезо́н, секу́нда, метро́*. Іх напісанне трэба правяраць па арфаграфічным слоўніку.**

**124.** Прачытайце тэкст. Пра што новае вы даведаліся? Якія правілы паводзін у грамадскім транспарце вам вядомы?

Метро — гэта г..р..дская электрычная чыгунка, звычайна падз..мная. Метрапалітэн — самы хуткі, зручны і экалагічна чысты від г..р..дскога пасажырскага транспарту. У Рэспубліцы Б..ларусь метро пабудавана ў Мінску.

Знайдзіце ў тэксце аднолькавыя па значэнні словы. Якія літары трэба ўставіць на месцы пропускаў? Спішыце апошні сказ. Пастаўце ў словах націск.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**125.** Прачытайце тэкст. Што вы думаеце пра Стасікаў учынак? Як хлопчык ставіцца да матулі? Да іншых людзей? Дакажыце.

## Стасікава кладка

У Стасіка захвар..ла маці. Яна л..жала ў ложку і цяжка дыхала. Стасік с..дзеў каля акна і чакаў доктара. Ён хутка выл..чыць маму.

На дварэ ішоў дождж. Насупраць пад'езда ўтварылася в..лікая лужына.

«А як жа да нас доктар пройдзе?» — падумаў Стасік.

Хлопчык паклаў дошку на ц..гліны ўпоперак лужыны. Нарэшце прыйшоў доктар.

— Вось мы зараз **т..мпературу** змераем і не дадзім хвар..ць тваёй маме!

Доктар выпісаў **р..цэпт**, разв..таўся. Ён хутка выйшаў з пад'езда, перабег па кладцы лужыну і засп..шаўся да іншых хворых. *(М. Даніленка.)*

Растлумачце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі. Запішыце іх. Напісанне выдзеленых слоў удакладніце па арфаграфічным слоўніку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**126.** Складзіце прыказкі са слоў. Прачытайце іх. Чаму так гавораць?



Птушка

рада — вясне,

а

дзіця —

маці



д..бра сонейку пры

ц..пла,

Пры мамцы

Запішыце прыказку. Пастаўце ў словах націск.



**127.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі. Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце.

Вісіць — з..лёны,
л..ціць — жоўты,
л..жыць — чорны.

Т С І Л

Паміж гор с..дзіць Рыгор,
кап..люшом накрыты.

Б Г Ы Р



Спампавана з сайта www.aversev.by

М..ту, м..ту — не вым..ту,
н..су, н..су — не вын..су.




Спішыце адну загадку на выбар. Пастаўце ў словах націск. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

## Зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме літарамі



— Ура! Я здагадаўся! Галосныя ад слова «галасіць»! — узрадаваўся Чамучык. — А зычныя ад слова «зычыць»? Правільна?

Як адрозніць зычныя гукі ад галосных?

**128.** Вымавіце гукі. Па якой прымеце яны падзелены на дзве групы? У якую групу трэба змясціць гукі з капелюша?




Як вымаўляюцца галосныя гукі, а як — зычныя? Колькі ў беларускай мове літар для абазначэння зычных гукаў?



Спампавана з сайта www.aversev.by



**Пры вымаўленні зычных гукаў паветра сустракае перашкоды (губы, зубы, язык).**

**Зычныя гукі ўтвараюцца голасам і шумам ([р], [м], [н'], [л'], [ў] і іншыя) ці толькі шумам ([ш], [х], [к'], [с'], [ф] і іншыя).**

**129.** Літары якіх гукаў запісаны ў першым слупку? А ў другім?

| | |
|---|---|
| ..а..ы..а | м..ш..н.. |
| ..а..ё.. | ш..ф..р |
| ..а..о..а | д..р..г.. |



Разгледзьце малюнак і падумайце, якое слова зашыфравана ў кожным радку.

Вымавіце словы. Назавіце зычныя гукі ў іх. Запішыце словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Вусна падбярыце да кожнага слова блізкае па значэнні слова. Вусна складзіце сказы з гэтымі словамі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**130.** Прачытайце і адгадайце загадку. Вымавіце выдзеленыя словы. Якая схема адпавядае кожнаму з іх? Назавіце ў словах зычныя гукі.



Хто з..лёнымі в..чамі
грозна бліскае н..чамі?
Мае пухленькія **лапкі,**
мае кіпцікі-царапкі?
Спінку пругка выгінае,
**страх** на **мышак** наганяе?

*У. Мацвеенка.*



Знайдзіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Якія гэта гукі — галосныя ці зычныя?

Запішыце па памяці першы сказ. Пастаўце ў словах націск. Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

**131.** Разгледзьце малюнак. Назавіце мянушкі жывёл. Прачытайце тэкст, дапаўняючы яго мянушкамі жывёл. Хто на малюнку лішні?

У нашай суседкі гаспадарка: пев..нь, куры, кураняткі, стара́я каза ..., казёл ... і маленькі парсючок ... .



Спампавана з сайта www.aversev.by




Цэлы дзень ... і ... шукаюць шчыліну, каб у агарод улезці. Іх з капусты і дубцом не выганіш.

Часам жанчына пасвіць сваю жывёлу на беразе рэчкі. Сама с..дзіць на беражку ды галінкай камароў адганяе. Парсючок ... ў п..сочку качаецца. Казёл з казою в..р-балоз аб’..даюць. Усім добра!

Колькі частак у тэксце? Аб чым гаворыцца ў кожнай з іх? Перакажыце трэцюю частку тэксту.

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Растлумачце іх правапіс. У двухскладовых словах падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Запішыце назвы жывёл, якіх даглядае жанчына, і іх мянушкі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**132.** Прачытайце скорагаворку. Як вы разумееце выраз «след у след»? Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку.



Гусі крочылі гуськом
след у след за гусаком.
*У. Мазго.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

## Вымаўленне і правапіс слоў з *ў*



Чамучык паўтараў алфавіт і здзівіўся:

— Навошта ў беларускай мове ***у*** і ***ў***? Яны ж амаль аднолькавыя! Падумаеш, невялікая загагулінка ўверсе!

Хлопчык задумаўся і вырашыў запытацца пра гэта ў настаўніцы. Як вы думаеце, што адказала настаўніца?

Якая розніца паміж гукамі [у] і [ў]? Калі пішацца літара ***ў***?

**133.** Разгледзьце малюнкі. Каго вы бачыце на іх? Для якой прафесіі існуе яшчэ адна назва?



Спампавана з сайта www.aversev.by



н_ _ _ _ _ _ _к



б_ _ _ _ _ _к



к_ _ _р*



ц_ _ _ _ _ _ _к*



к_ _ _ _ _ _ _т

У якіх словах вымаўляецца гук [у], а ў якіх — [ў]? У якім слове ёсць гукі [у] і [ў]? Запішыце словы з ***ў***. Падкрэсліце літару галоснага перад ***ў***. Растлумачце правапіс слоў.



**Гук [ў] — зычны. Ён абазначаецца літарай *ў* (*у* нескладовае). Літара *ў* пішацца пасля галосных: *лаўка, спяваў, добры ўлоў*.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**134.** Знайдзіце словы ў «ланцужку» складоў. Вымавіце іх.



| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| кра | | кі | | нік | | броў | | вун | | то | |
| | соў | | раў | | ся | | ка | | аў | | бус |



Здагадайцеся, якія склады прапушчаны. Вымавіце словы.

| | | |
|---|---|---|
| са | | нік |
| | | |

| | | |
|---|---|---|
| | | |
| шпа | | ня |

| | | |
|---|---|---|
| вя | | ка |
| | | |

Запішыце словы з ***ў***. Падкрэсліце ***ў*** разам з папярэдняй літарай.

**135.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

Ж..рботным клінам жура..лі
на по..дзень пла..на праплылі.

*М. Пазнякоў.*

Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце іх правапіс. Запішыце скорагаворку па памяці. Падкрэсліце ***ў***.

**136.** Прачытайце тэкст. Пра што цікавае вы даведаліся? Якія літары закрыты сонейкам?



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Маленькая птушка



Якая пт☼шка самая маленькая ў Беларусі? Гэта жо☼тагаловы каралёк. Людзі яшчэ называ́юць яго па☼ночным калі́бры. Важыць пт☼шка каля пяці грама☼. Апярэнне ў каралька вельмі мяккае і п☼шыстае. На галаве ў пт☼шкі жо☼ты або аранжавы ч☼бок. Ён нагадвае сапра☼дную карон☼. Дзяк☼ючы яму пт☼шка і атрымала сваю назв☼.

Запішыце словы з прапушчанымі літарамі. Спішыце пытанне і адказ на яго.

**137.** Прачытайце верш. Як змяніўся месяц? Якія літары трэба ўставіць у словы? Чаму?

Светлы месяц-калабок  
пах*(у/ў)*дзе*(у/ў)*, ста*(у/ў)*, як сярпок.  
Лёг у хмаркі і да ранк*(у/ў)*  
сл*(у/ў)*ха*(у/ў)* зорак калыханк*(у/ў)*.

*П. Прануза.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**138.** Прачытайце прыказкі. На якую яны тэму? Растлумачце іх сэнс.

**ся́бар**

У бядзе сябра пазнаю́ць.
Не май сто рублёў, а май сто сяброў.

Растлумачце правапіс літары **ў**. Запішыце другую прыказку.

**139.** Прачытайце сказы. У якіх словах літара **ў** не пішацца пасля галосных?

1. Да брата Уладзіміра прыехаў сябар. 2. Пра нашага сябра Улада напісалі ў газеце. 3. Вясёлы, упарты хлопчык стаў нашым надзейным сябрам. 4. Мы даслалі прывітанне сябру з гарадскога пасёлка Ушачы.

Спішыце першы сказ. Слова з літарай **ў** падзяліце для пераносу. У слоўнікавым слове пастаўце націск, падкрэсліце літары галосных гукаў.



Вялікай літары **ў** не бывае: *да сястры Уладзіславы, вуліца Усходняя.*
Літара **ў** не пішацца пасля знакаў прыпынку: *Дзеці гулялі ў парку, у садзе.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

**140.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце назвы ягад. Якія ягады вы каштавалі? Якія вам найбольш спадабаліся?


суніцы


ажы́ны


маліны


чарніцы


буякі́

Прачытайце верш. Замест малюнкаў называйце ягады.

З мамай я збіра*(у/ў)* ,
а з баб*(у/ў)*ляю — .
Ездзі*(у/ў)* з татам у ,
а з дзяд*(у/ў)*лем — у .
Запрасілі **сябрукі**
нас наза*(у/ў)*тра *(у/ў)* .

*М. Пазнякоў.*

Якімі словамі можна замяніць выдзеленае слова?

Спішыце словы з літарай ***ў***, падзяляючы іх для пераносу.


Спампавана з сайта www.aversev.by



Па-беларуску кажуць: *з татам, дзядулем*. Але: *з мамай, бабуляй*.

**141.** Прачытайце тэкст. Пра якіх жывёл вы даведаліся? Растлумачце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

Лістапад — апошні мес..ц вос..ні. **У лістападзе кладзецца у б..рлогу м..дзведзь.** Лісіцы мышкуюць у палях. **Вавёркі зм..нілі летняе футра на зімняе.** Зайцы-бел..кі таксама апранаюць зімовае футра — белае і пушыстае. У гэтым ахоуным адзенні іх нялёгка зауважыць на снезе. **У лістападзе адл..таюць на поудзень апошнія дзікія качкі.** *(В. Вольскі.)*

Якія гукі вымаўляюцца на месцы літар у «берэтах»: [у] або [ў]? Якімі літарамі іх трэба абазначыць на пісьме? Спішыце выдзеленыя сказы. Падкрэсліце ***ў*** разам з папярэдняй літарай.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**142.** Прачытайце скорагаворкі. Выберыце літары, якія неабходна ўставіць у словы. Растлумачце іх правапіс.

Малы *(У/ў)*лас *(у/ў)*лез *(у/ў)* гразь. *(А. Клышка.)*

*(У/ў)*летку *(У/ў)*льяна пайшла на палян*(у/ў)*.

Спішыце скорагаворкі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**143.** Прачытайце сказы. Якіх слоў не хапае? Якія асаблівасці правапісу ***у*** вы заўважылі ў гэтых словах?

***аква́рыум***

1. … — гэта шкляная пасудзіна для ўтрымання і гадоўлі рыб, іншых водных жывёл, раслін. 2. Той, хто разводзіць акварыумных рыб, — … . 3. Гупі, …, … — гэта … рыбкі.

Словы для даведкі: *акварыумі́ст, ля́ліус, аква́рыумныя, гура́мі, акварыум.*

Запішыце словы ў тым парадку, у якім яны павінны быць у сказах.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**У некаторых словах, якія прыйшлі ў нашу мову з іншых моў, літара *ў* не пішацца пасля галосных. Напрыклад: *страус, соус, шлагбаум, лінолеум, акіянарыум, ток-шоу*. Іх напісанне трэба правяраць па арфаграфічным слоўніку.**

**144.** Прачытайце верш. Выберыце літары, якія неабходна ўставіць у словы. Растлумачце іх правапіс.



У аквары*(у/ў)*ме гупі
падабаецца быць гр*(у/ў)*пай.
Між раслін, як нідзе,
ім так хораша ў вадзе.

*М. Пазнякоў.*

Спішыце першы сказ. У слоўнікавым слове пастаўце націск. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

Разгледзьце малюнак. Вусна апішыце, як выглядаюць рыбкі.

**145.** Прачытайце тэкст. Якія гукі вымаўляюцца на месцы рыбкі ў словах? Якімі літарамі іх трэба абазначыць на пісьме?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Тата падары Па ліку акварыум з рыбкамі. Хлопчык вельмі любі рыбак. Заўсёды кармі іх, мяня у акварыуме вад. Тата расказаў Па ліку, што рыбы прадказваюць надвор’е.



Спішыце першыя два сказы. Падкрэсліце ў словах літару ***ў***.

Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як рыбы прадказваюць надвор’е.

**146.** Прачытайце. Дапоўніце выдзелены сказ назвамі рыб (па малюнках). Як вы думаеце, для каго будзе карысная інфармацыя, пададзеная ў тэксце? Чаму?



суда́к



шчупа́к



галаве́нь

Якая рыба водзіцца ў вадаёме, можна вызначыць па глебе берага. **Калі бераг глiністы, можна сустрэць ..., ..., ... .** Каб злавіць іх, трэба выбраць мясцінку, дзе ёсць цячэнне. Хуткая вада прываблівае рыбу, бо цячэнне выносіць дробны корм



Спампавана з сайта www.aversev.by

для яе. Яшчэ рыба любіць вадаёмы з падводнымі валунамі і глыбокія завадзі. *(З часопіса «Вясёлка».)*

Растлумачце правапіс літар **у** і **ў**.

Запішыце выдзелены сказ. Назвы рыб у ім размясціце ў алфавітным парадку.

**147.** Прачытайце прымаўку. Калі так гавораць?

Рыбка *(у/ў)* рацэ, а не *(у/ў)* р*(у/ў)*цэ.

Спішыце. Растлумачце правапіс літар, якія ўставілі. Падкрэсліце літару **ў**.

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам.

## Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі



Чамучык дыктаваў сам сабе і старанна выводзіў слова.

— Кккллллооон, — прамаўляў ён.

Прачытаў для праверкі і не пазнаў слова «клён». У яго атрымалася іншае слова. Якое? Як вы думаеце, чаму так здарылася?

Як абазначыць на пісьме мяккасць і цвёрдасць зычных гукаў?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**148.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках. Якімі гукамі адрозніваюцца словы? Якой літарай на пісьме перадаюцца гэтыя гукі?

п..льцы   п.́.льцы*

Запішыце словы. Падкрэсліце літары, якімі яны адрозніваюцца.

Вусна складзіце сказы з гэтымі словамі.

**149.** Разгледзьце схему. Якія гукі схаваны пад вывамі сухароў і пончыкаў? Якія літары закрыты?




Назавіце гукі, якія ўтвараюць пары па цвёрдасці-мяккасці. Як на пісьме перадаюцца цвёрдасць і мяккасць зычных гукаў?



Спампавана з сайта www.aversev.by



Зычныя гукі бываюць цвёрдыя і мяккія. Цвёрдасць зычных гукаў на пісьме абазначаецца літарамі ***а, о, у, ы, э***: *ла, мо, ну, чы, рэ*; мяккасць — літарамі ***е, ё, і, ю, я, ь***: *ке, лё, бі, лю, пя, нь.*

**150.** Знайдзіце назву кожнага прадмета. Раскажыце, для чаго патрэбны гэтыя рэчы. Вымавіце словы. У якіх словах усе зычныя гукі цвёрдыя?




Запішыце словы, якія адпавядаюць схемам, і падзяліце іх для пераносу. Пастаўце націск.

**151.** Прачытайце тэкст. Пра што новае вы даведаліся? Як вы думаеце, чаму людзі перасталі карыстацца збанамі?

## Збан

Сёння збан рэдка ўбачыш. Калісьці нашы продкі ў ім захоўвалі малако. Ды і не



Спампавана з сайта www.aversev.by



толькі малако. Ёсць такая прымаўка: «Да пары збан ваду носіць». Некалі ў збанах насілі ваду з крыніц.

Выраблялі збаны з гліны. Часта размалёўвалі іх рознымі ўзорамі. Некаторыя збаны мелі ручку-вушка, каб было зручней іх насіць. На звужаным горле збана рабілі дзюбку. Струменьчык малака быў тоненькі, і малако не разлівалася. *(А. Бадак.)*

Выпішыце з тэксту прымаўку. Калі яе можна ўжыць? Падкрэсліце ў прымаўцы словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя. Пастаўце ў словах націск.

**152.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

*Рот п..вінен рукам дзяк..ваць. Рэшатам в..ды не нан..сіш.*

Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

Спішыце. Падкрэсліце ў словах першай прыказкі літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі. У словах другой прыказкі — мяккія зычныя гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**153.** Разгледзьце табліцу. Вымавіце склады кожнага радка. Якія зычныя гукі — цвёрдыя ці мяккія — вы вымаўлялі ў першым радку? У другім? Якія літары паказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага гука, а якія — на цвёрдасць?

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ? | ны | ? | ма | су | ? | зо |
| лю | ? | ге | мі | ? | мя | ? |

Запішыце прапушчаныя склады. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме. Прывядзіце прыклады слоў з гэтымі складамі. Вызначце націскны склад.

**154.** Прачытайце. Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку.

Лоўка Лёўка
маляваў алоўкам
у аблоках самалёты,
у якіх ляцяць пілоты.

*А. Котава.*

Якія словы адрозніваюцца адным гукам? Вымавіце гэтыя гукі. Запішыце словы. Падкрэсліце літары, якімі яны адрозніваюцца.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**155.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх патрэбнымі словамі.


Карыстайцеся падказкай у дужках.

Вова ... мяч у вароты. Міша ... сшытак дома. (*заб..ў*)

Мама гатавала ..., а дзядуля кошык ... . (*пл..ў*)


У калодзежы было ... вады. Міла ... паперку ў руках.

У Бураціна доўгі ... . Сяргей ... кнігі ў бібліятэку.

Запішыце пары слоў, якімі дапаўнялі сказы. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

**156.** Прачытайце тэкст. Як Ігар дапамагаў сваім бацькам?

## Дапамога бабулі

Прыйшоў час збіраць ур..джай. Ігар з бацька́мі прыехаў у вёску. Хлопчык з задавальненнем дапам..гаў ім капаць бульбу. З татам яны ссыпа́лі бульбу ў м..хі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Потым перавозілі мяхі ў склеп. Разам яны хутка справіліся з работай!

Вечарам бабуля наварыла бульбы і пасмажыла мяса. Уся с..м’я сабралася за ст..лом. Бабуля падзякавала ўсім за дапамогу.

Колькі ў тэксце частак? Аб чым гаворыцца ў кожнай з іх? Вусна перакажыце адну з частак тэксту.

Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце іх правапіс. Запішыце пад дыктоўку другую частку тэксту. Падкрэсліце словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя.

**157.** Прачытайце. Пра якія стра́вы з бульбы расказваецца ў вершы? Якія з іх вы каштавалі?

З **бульбы** добрай нашай
робяць **клёцкі**, кашу,
**пірагі** з грыбамі,
з мясам, **буракамі**.

*А. Дзержынскі.*

Спішыце. Падкрэсліце ў выдзеленых словах літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Мяккі знак — паказчык мяккасці зычнага гука



Чамучык разам з бабуляй прыбралі ў печы. Хлопчык адправіў матулі паведамленне: «Мама, я вымеў з печы ўвесь вугал!» Маці прачытала паведамленне і рассмяялася.

Што на самай справе вымеў з печы Чамучык?

Што абазначае на пісьме мяккі знак?

**158.** Прачытайце верш. Аб чым у ім гаворыцца? Ці складалі вы скорагаворкі?

Мяккі знак
сядзеў на ўзгорку,
прыдумляў
скорагаворку:

— Дзінь, дзень,
цінь, цень —
лёг цень
на пляце́нь*.

*М. Чарняўскі.*

У якіх словах для абазначэння мяккасці зычных выкарыстаны мяккі знак? Вымавіце гэтыя словы і запішыце іх. Падкрэсліце літару **ь**.

Якім словам з верша адпавядае схема ●●●?



**Літара ь гука не абазначае: *пень* [п’эн’]. Яна паказвае на мяккасць папярэдняга зычнага гука.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**159.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках. Вымавіце гукі, якімі адрозніваюцца пары слоў. Якой літарай трэба перадаць мяккасць зычных гукаў на пісьме ў словах?

   

Запішыце словы парамі. Падкрэсліце літару, якая гука не абазначае.

**160.** Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку? Чаму Міхаська пачырванеў?

## Дзіўнае спаборніцтва

Міхаська любіў выхваляцца, што ён нікога не баіцца.

Аднойчы ён выйшаў на двор з булкай у руцэ. Суседскі певень угледзеў булку і ўмомант падскочыў да Міхаські. Хлопчык спужаўся і кінуўся ўцякаць.

У гэты час з работы вяртаўся бацька. Ён убачыў сына і спытаў:

— Чаго ты гойсаеш навыперадкі з пеўнем?



Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ды гэта я... я правяраю, хто з нас шпарчэй бегае, — адказаў Міхаська, чырванеючы. *(П. Рунец.)*

Выпішыце словы з літарай **ь**, падзяляючы іх для пераносу. Растлумачце ўжыванне **ь**.

**161.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Прыдумайце, што магло адбыцца далей. Раскажыце.

Бацькі́ купілі Вользе  .

Васіль даслаў сябру  .

У Альбіны прыгожая  .

Запішыце сказ на выбар. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных.



**162.** Прачытайце скорагаворку А. Клышкі. Якая літара прапушчана ў словах? Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.

*Для мален..кай Ленкі*
*абляпілі пен.. апен..кі.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі (глядзіце форзац).



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Гук [дз’]. Яго абазначэнне на пісьме



Чамучык слухаў музыку. Яго зачаравалі гукі песні. Раптам хлопчык задумаўся: які гук надае беларускай мове мілагучнасць? Ён гучыць нібы званочак. Ці здагадаліся вы, які гэта гук?
Як на пісьме абазначаецца гук [дз’]?

**163.** Разгледзьце малюнкі. Як вы думаеце, якая размова адбылася паміж людзьмі? Якія ветлівыя словы яны ўжывалі?






Запішыце словы ветлівасці. У якіх словах ёсць гук [дз’]? Падкрэсліце літары, якімі ён перадаецца на пісьме.



**Гук [дз’] — мяккі, на пісьме ён абазначаецца спалучэннем літар *д* і *з* — *дз*: [дз’]*ік* — *дзік*.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**164.** Прачытайце словы. Назавіце першы гук у словах.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **дзе-** | ці<br>вяць<br>сяць<br>янне | **дзі-** | чка<br>ва<br>ця<br>кабраз | **дзя-** | журны<br>дзька<br>дуля<br>цел |

Выпішыце з першага слупка слова, якое называе адзін дзясятак, з другога — назву жывёлы, а з трэцяга — назву птушкі. Падкрэсліце літары, якімі на пісьме перадаецца гук [дз'].

**165.** Прачытайце скорагаворку. Вымавіце словы з прапушчанымі літарамі. Які гук вымаўляецца ў словах на месцы пропуску? Якімі літарамі яго трэба абазначыць на пісьме?

У са..е ў лістапа..е
апошні ліст апа..é.

*В. Жуковіч.*

Спішыце скорагаворку. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**166.** Прачытайце верш. Як ставіцца аўтар да Радзімы?
Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў? Якімі літарамі іх трэба абазначыць?

З дрэваў лісцейка асыплецца,
прый..е белая зіма.
Родны край, зямля а..іная, —
больш такой ні..е няма.

*В. Жуковіч.*

Спішыце верш. Падкрэсліце літары, якія ўставілі, і літары пасля іх.

## Гукі [д] і [дз’]. Іх абазначэнне на пісьме

**167.** Вымавіце словы парамі. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Які з гукаў цвёрды, а які — мяккі? Якімі літарамі яны передаюцца на пісьме?

вада — у вадзе
каманда — у камандзе
градá — на градзе
прырода — на прыродзе

Спішыце словы з гукам [дз’]. Падзяліце іх для пераносу.


Спампавана з сайта www.aversev.by



**Цвёрды гук [д] і мяккі гук [дз’] — парныя. Цвёрдасць гука [д] перадаецца на пісьме літарамі *а, о, у, ы, э*: *вада*. Мяккасць гука [дз’] — літарамі *е, ё, і, ю, я, ь*: *у вадзе*.**

**168.** Разгледзьце схему. Дапоўніце яе патрэбнай інфармацыяй.

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю, які гук у слове:

| | |
|---|---|
| цвёрды [?] | мяккі [дз’] |
| ↓ | ↓ |
| пішу *д* (пасля *д* пішуцца ?, ?, ?, ?, ?). | пішу ? (пасля ? пішуцца *е, ё, і, ю, я, ь*). |

Адкажыце па схеме, якія літары трэба запісаць у словах *гняз..о, ..ённік, ха..іў, ..аведнік, па..яка*.

**169.** Прачытайце верш. Як вы думаеце, чаму ён мае такую назву? Чым тата-мядзведзь лячыў дзяцей?


Спампавана з сайта www.aversev.by

## Дзякуй, тата!

Сталі дзеці хварэць.
Варыць лекі м..дзведзь:
аднаму — чарнічак,
другому — сунічак,
трэцяму — чабарок
і для кожнага — м..док.
Бегаюць м..дзв..дз..няты:
— Ты выдатны доктар, тата!

*Н. Галіноўская.*

***мядзве́дзь***

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс. Праверце напісанне слоў па арфаграфічным слоўніку.

Назавіце словы з гукам [дз’]. Запішыце іх. Пастаўце ў словах націск, падкрэсліце ***дз***.

**170.** Прачытайце тэкст. Каго называюць лістападнікамі?

Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў у словах? Якімі літарамі іх трэба абазначыць на пісьме?

## Лістападнік

Была ня..еля. Восеньскім ..нём вырашыў я паха..іць па лесе. Раптам пачуў піск і з..івіўся. Па ствале старога ..рэва скака́ла



Спампавана з сайта www.aversev.by

сойка. Птушка гля..ела ўніз. Там ся..еў маленькі зайчык. Сойка хацела ўхапіць яго за вуха. Я а..агнаў птушку і ўзяў зайчыка ў ..алоні. Ён быў зусім маленькі, ..аверлівы і нікуды не ўцякаў. Такіх позніх зайчанят называюць лістапа..нікамі.



Каб сойка не крыў..іла зайчаня, я аднёс яго ..алей у лес. Паса..іў у на..ейнае месца пад густой елкай. Зайчыха зной..е яго там.

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**171.** Прачытайце верш. За што бусляняты будуць удзячны тату?

### Едзе вячэра



Перахо..іць бус..л брод* —
..юба ўгору ўзве..ена.
Гэта е..е бутэрброд
з жабкамі ўсярэ..іне
на в..чэру бусл..нятам.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Добра быць
з цыба́тым* татам!
*Р. Барадулін.*

Якія літары трэба ўставіць у словы? Чаму?

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**172.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Які гук вымаўляецца ў словах на месцы пропускаў?

| | |
|---|---|
| Гарбузы ляжаць ... . | у ва..е |
| Вішні растуць ... . | на гра..е |
| Рыбы плаваюць ... . | у са..е |
| Птушаняты пішчаць ... . | у гняз..е |

Спішыце два сказы на выбар. Устаўце ў словы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

**173.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках.



Запішыце словы, у якіх ёсць гук [дз’]. Падкрэсліце літары, якімі ён абазначаецца на пісьме.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**174.** Прачытайце і адгадайце загадку.



**На т..нен..кай ножцы ст..іць,**
**с..нейкам на неба гля..іць.**
*У. Мацвеенка.*

Растлумачце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

Запішыце загадку разам з адгадкай. Удакладніце напісанне слова-адгадкі па арфаграфічным слоўніку.

Пастаўце ў словах націск. Падкрэсліце літару, якая гука не абазначае.

**175.** Прачытайце тэкст. Якую добрую справу зрабілі хлопчыкі? Растлумачце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

## Сланечнікі

**Вясной Ва..ім і Вало..я паса..ілі сланечнікі.** Яны раслі вельмі хутка. Летам сланечнікі зацвілі. Кветкі ў іх былі прыгожага жо..тага кол..ру. Дзеці любілі іх фатаграфаваць. Паказвалі расліны сябра́м.

Непрыкметна мінула ц..плае лета. На агаро..е даспелі сланечнікі. Сюды пачалі прыл..таць птушкі. Яны са..іліся на сланечнікі і выдзёўбвалі буйны́я з..рняты.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Хлопчыкі не крыўд..іліся на пт..шак. **На кожным сланечніку было шмат з..рнятак.** Іх хапіла ўсім.

**Самы в..лікі сланечнік хлопчыкі прывезлі ў падарунак бац..кам.** Яны здзівіліся і ўзрадаваліся.

Прачытайце загалоўкі да частак тэксту. У якой паслядоўнасці іх трэба размясціць?

1. Сланечнік у падарунак.
2. Сланечнікі зацвілі.
3. Птушкі частуюцца зярняткамі.

Вусна перакажыце адну з частак тэксту.

Запішыце пад дыктоўку выдзеленыя сказы. Зрабіце ўзаемаправерку.

**176.** Прачытайце верш. Што вы даведаліся пра хлопчыка і дзяўчынку?

Ці бу́*(д/дз)*ень*, ці ня*(д/дз)*елька —
ім вес*(е/я)*ла ў двары.
*(А/а)*ндрэйка і *(Н/н)*а*(д/дз)*ейка —
сусе*(д/дз)*і і с*(е/я)*бры.

*У. Мазго.*

Растлумачце выбар літары ў дужках. Спішыце верш.


Спампавана з сайта www.aversev.by

## Гукі [т] і [ц’]. Іх абазначэнне на пісьме



Чамучык і яго бацькі вырашылі заказаць на юбілей дзядулі торт. Яны накіраваліся на хлебазавод. Там выбралі торт і сталі афармляць заказ.

Пад дыктоўку Чамучык напісаў: «Торт “Юбілейны”». Наступны радок: «Надпіс на торце». Чамучык падумаў і напісаў: «Віншуем цябе, дзядуля!»

Задумаўся хлопчык: чаму *тор**т***, але *на тор**це***?

Як на пісьме перадаюцца парныя па цвёрдасці-мяккасці гукі [т] і [ц’]?

**177.** Назавіце прадмет на першым малюнку. Якая схема адпавядае гэтаму слову?

Прачытайце подпіс пад першым малюнкам. Які гук змяніўся ў слове *торт*? Якой літарай ён абазначаны? Запішыце пару слоў. Падкрэсліце літары, якімі абазначаны гукі [т] і [ц’].

Выканайце гэтыя заданні для другой пары слоў.







на тор**це**







у ракe**це**



Спампавана з сайта www.aversev.by



Гукі [т] і [ц’] — парныя. Гук [т] — цвёрды. На пісьме абазначаецца літарай ***т***. Пасля ***т*** пішуцца літары ***а, о, у, ы, э***: ***т****алерка*, *ка****т****ок*.

Мяккі гук [ц’] на пісьме абазначаецца літарай ***ц***. Пасля літары ***ц***, якая абазначае мяккі гук [ц’], пішуцца ***е, ё, і, ю, я, ь***: ***ця****пло*, *ка****цё****л*, *пе****ць***.

**178.** Разгледзьце схему. Дапоўніце яе патрэбнай інфармацыяй.

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю, які гук у слове:

| | |
|---|---|
| цвёрды [?] | мяккі [ц’] |
| ↓ | ↓ |
| пішу ***т*** (пасля ***т*** пішуцца ?, ?, ?, ?, ?). | пішу ? (пасля ? пішуцца ***е, ё, і, ю, я, ь***). |

Раскажыце з апорай на схему, якія літары неабходна запісаць у словах *дзе..і, п..ушка, ле..а, дзя..ел*.

Запішыце словы з гукам [ц’].



Спампавана з сайта www.aversev.by

**179.** Прачытайце верш. Раскажыце, якую карціну вы ўявілі.

Які гук вымаўляецца на месцы сняжынак у словах? Якой літарай яго трэба абазначыць на пісьме?

Ве❄ер. Ноч. Ля❄я❄ь сняжынкі.
Дрэмле ❄е́мра ля кустоў.
Выбег зайчык на с❄яжынку
пашука❄ь сваіх сяброў.

*М. Рудзішкін.*

Запішыце словы з прапушчанымі літарамі пад дыктоўку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі. Зрабіце ўзаемаправерку.

**180.** Прачытайце загадку. Назавіце словы з гукам [ц’].

**Што нас корміць, а есці не просіць?**

**(з, м, л, я, е, я)**

Выберыце толькі патрэбныя літары і састаўце слова-адгадку.

Запішыце загадку з адгадкай. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Гук [ц’]. Яго абазначэнне на пісьме

**181.** Назавіце, што вы бачыце на малюнках. Вымавіце першы гук у кожным слове.







Запішыце словы. Падкрэсліце ***т, ц*** разам з наступнымі літарамі.

**182.** Прачытайце. Размясціце радкі калыханкі ў правільнай паслядоўнасці. Знайдзіце словы з гукам [ц’]. Вымавіце іх.

Прыйдзі ў хату начаваць,
Ах ты, коцік, мой каток,
у цябе шэранькі хвасток.
маю Волечку качаць.

Запішыце калыханку. Падкрэсліце літару ***ц*** разам з наступнай літарай.

**183.** Разгледзьце фотаздымак. Для чаго патрэбны гэтыя прыстасаванні? Прачытайце тэкст і праверце свой адказ.


Спампавана з сайта www.aversev.by

# Калыскі



У чым спі☆ малое дзі☆? Ну вядома ж, у калысцы. Раней іх яшчэ называ́лі люлькамі. Яны мала былі́ падобны на ☆перашнія пас☆лькі.

Калыскі рабілі з дошак або плялі з лазы. Нярэдка калыскай служылі лёгкія драўляныя начо́ўкі*. Ба☆кі́ стараліся так прыладзі☆ калыску, каб яна злёгку гайдалася. Нібы сама закалыхвала дзі☆.

Якія літары закрыты зорачкамі? Выпішыце з тэксту гэтыя словы. Растлумачце іх правапіс.

**184.** Складзіце сказы з апорай на малюнкі. Назавіце словы з гукам [ц’].

на  е

у  е



на  е

у  е



Спампавана з сайта www.aversev.by

на  е | у  е

Запішыце два сказы. Падкрэсліце ў словах літару, якая абазначае гук [ц'], і літару пасля яе.

**185.** Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

*(Т/Ц)*іха, *(т/ц)*іха<br>
ко*(т/ц)*ік спі*(т/ц)*ь,<br>
сны салодкія ён сні*(т/ц)*ь.

*Л. Шырын.*

Спішыце. Падкрэсліце літару, якая абазначае гук [ц'], і літару пасля яе.

**186.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце словы пад імі. Растлумачце іх значэнне. У якім слове вымаўляецца гук [ц], а ў якім — [ц']?

 

сівец — сівець



Спампавана з сайта www.aversev.by

Прачытайце пары слоў. Растлумачце іх значэнне. Запішыце словы з гукам [ц’]. Падкрэсліце ***ц*** і наступную літару.

цела — цэла цані — цяні
сцены — сцэны месяц — месяць

**187.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

***чацве́р***

Чацвёра ў чацвер, а пяцёра ў пятніцу. *(А. Клышка.)*

Запішыце слоўнікавае слова. Пастаўце націск. Падкрэсліце ў слове літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

**188.** Прачытайце загадку. Ці правільна адказала Таня?

Тамара Таню запытала:
— За чацвяргом дзень як завецца?
А Таня Томе адказала:
— Ды серада, здаецца...

*С. Шах.*

Успомніце назвы дзён тыдня. Запішыце іх па парадку. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць гукі [ц’], [дз’].


Спампавана з сайта www.aversev.by

**189.** Прачытайце тэкст. Для каго дзед садзіў яблыні? Аб чым гэта сведчыць?

## Дзед і яблыні

Дзед са..іў яблыні. Яму сказалі: «Навошта табе яблыні? Доўга чака..ь з гэтых яблынь пладоў, і ты не з'ясі з іх яблычкаў». Стары адказаў: «Я не з'ем — іншыя з'яду..ь, мне падзякую..ь». *(Л. Талстой.)*

Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў? Якія літары трэба ўставіць у словы?

Выпішыце словы з гукам [ц'].

**190.** Прачытайце прыказкі. Якую мудрасць яны змяшчаюць? Якія літары трэба ўставіць у словы?

Шануй людзей, то і *(т/ц)*ябе пашаную*(т/ц)*ь.

Лепей крышку зрабі*(т/ц)*ь, чым багата нагавары*(т/ц)*ь.

Сады садзі і ў маладос*(т/ц)*і, і ў старас*(т/ц)*і.

Запішыце прыказку, якая падыходзіць да тэксту «Дзед і яблыні».



Спампавана з сайта www.aversev.by

**191.** Прачытайце народную прымету. Які гук вымаўляецца на месцы кляновых лістоў у словах? Якой літарай яго трэба абазначыць?

Ліс…е да замаразкаў апала — бы…ь зіме …ёплай.

Спішыце. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

## Зацвярдзелыя зычныя гукі



Чамучык з бацькамі адпачываў на моры. На пляжы было шмат людзей. Яны размаўлялі на розных мовах.

Раптам Чамучык пачуў:

— Марына! Ты не забыла чысты купальнік і крэм? Сярожа, не бяры ў мора мяч!

— Гэта нашы землякі — беларусы! Я іх пазнаў па гаворцы! — растлумачыў Чамучык бацькам.

Якія гукі «падказалі» Чамучыку, што людзі размаўлялі па-беларуску?

Якія цвёрдыя зычныя гукі не маюць парных мяккіх гукаў?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**192.** Аб’яднайце гукі ў пары па цвёрдасці-мяккасці.

[дж] [в’] [с] [ш]
[ч] [м] [ж] [к’]
[н’] [к] [р] [м’]
[ц] [в] [с’] [н]

Вымавіце гукі, якія засталіся без пары. Якімі літарамі яны абазначаюцца? Запішыце. Падбярыце словы з гэтымі гукамі.



Зычныя гукі [ж], [ш], [дж], [ч], [р], [ц] — **зацвярдзелыя.** Яны не маюць парных мяккіх гукаў. Пасля літар ***ж, ш, р, ч, ц*** і спалучэння літар ***дж*** пішуцца ***а, о, у, ы, э***: *жолуд, машына, джэм, рэчка, чайнік, цукерка.*

**193.** Дадайце да слоў літару або склад, каб атрымаліся новыя словы.



□рыс рак□ □рэчка | г, і, а



Спампавана з сайта www.aversev.by



| | | |
|---|---|---|
| ☐чай | чай☐ | ца, нік, ру, |
| сон☐ | ляшчы☐ | на, бу, ка |
| чыгун☐ | ☐рак | |

Запішыце словы. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

***рукза́к***

**194.** Разгадайце рэбус.




Дапоўніце сказ словам, якое атрымалася.

**У маім ☐☐☐☐☐☐у ляжаць падручнікі, сшыткі і пенал.**

Спішыце сказ. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**195.** Прачытайце тэкст. Пра якіх птушак у ім гаворыцца? Якія літары прапушчаны ў словах? Растлумачце іх правапіс.

**У паветры круж..ліся лёгкія сняж..нкі. Р..горка ўбач..ў на р..біне птушак.**



Спампавана з сайта www.aversev.by



Якія яны прыгож..я! Спінкі ш..рыя, галоўкі ч..рныя, а бр..шкі ч..рвоныя. Гэта ... .

Падмацаваліся снегір.. ягадамі і заначавалі на др..ве. Птушкі ж..лі на р..біне, пакуль не падабралі апошнія ягадкі.

Чым адрозніваюцца птушкі на малюнку?

Як вы думаеце, якім можа быць працяг тэксту? Раскажыце.

Спішыце словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**196.** Прачытайце верш. Якое значэнне ў ім мае слова *месяц*?



Зімняй ночкаю празр..стай
месяц хітра пазірае.
Снег на елачцы пуш..стай
пер..лівамі іграе.

*В. Кажура.*

Растлумачце, якія літары прапушчаны ў словах.

Спішыце верш. У першым сказе падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**197.** Вызначце, які аднолькавы склад прапушчаны ў словах кожнага слупка.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ? | та | ці | ? | ня |
| | вот | вяр | | ня |
| | вёла | гаро | | на |

Выпішыце па два словы з кожнага слупка. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.



| У беларускай мове | У рускай мове |
|---|---|
| ↓ | ↓ |
| ***жы, шы, жэ, шэ, цэ*** | ***жи, ши, же, ше, це*** |
| ***жывот, шына, жэтон, цэмент*** | ***живот, шина, жетон, цемент*** |

**198.** Прачытайце верш. З кім аўтар параўноўвае ялінкі? Знайдзіце ў вершы словы, аднолькавыя па значэнні.

## Сустрэча

Ля самае сц..ж..нкі
стаяць, нібы дзяўч..нкі,



Спампавана з сайта www.aversev.by



з..лёныя ялінкі —
з іголкамі галінкі.
Махаюць нам — вітаюцца.
Да нас нібы
звяртаюцца:
— Вам, хлопч..кі, дзяўч..ткі,
падзяка за пасадкі!

*Р. Бохан.*

Якія літары трэба ўставіць у словы замест пропускаў? Растлумачце іх правапіс.

Спішыце словы з прапушчанымі літарамі, падзяляючы іх для пераносу.

**199.** Прачытайце тэкст. Чаму радаваўся дзядуля?

Дзед выр..шыў пасадзіць гр..цкі ар..х. Такога др..ва ў яго садзе яшчэ няма. Дапамагалі дзядулю ўнукі. Ж..ня выкапаў ямку. Кр..сціна роўненька тр..мала др..ўца. Дзядуля сыпаў зямлю ў ямку. Р..горка пр..нёс вядро вады. Маленькая Ір..на палівала зямлю вадой. Радаваўся дзядуля. Працавітыя ў яго ўнукі!

Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Запішыце пад дыктоўку чацвёрты і пяты сказы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**200.** Прачытайце сказы. Што неабходна зрабіць, каб пасадзіць дрэва? Размясціце сказы ў правільнай паслядоўнасці.

Паставіць саджанец і засы́паць карэнне зямлёй.
Выка́паць яму.
Палі́ць дрэўца вадой.
Выбраць саджанец і вызначыць месца для пасадкі.

Выпішыце са сказаў словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі.
Раскажыце, навошта людзі садзяць дрэвы.

**201.** Прачытайце скорагаворку. Якая літара прапушчана ў словах? Растлумачце яе правапіс.

У маш..ны — ш..ны,
а ш..пы ў ш..пш..ны.
*М. Пазнякоў.*



Спішыце. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.


Спампавана з сайта www.aversev.by

**202.** Прачытайце. Як вы думаеце, па якой прымеце словы падзелены на групы?

| | |
|---|---|
| цукар | цень |
| цэгла | цеста |
| цырк | цецярук |

Якія гукі абазначаны літарай ***ц***? Вымавіце словы. Які вывад вы можаце зрабіць?

Запішыце словы з гукам [ц].



**У беларускай мове ёсць зацвярдзелы гук [ц] і мяккі гук [ц’]. Яны не ўтвараюць пары па цвёрдасці-мяккасці. На пісьме гэтыя гукі абазначаюцца літарай *ц*.**

**203.** Прачытайце. Якія гукі абазначае літара ***ц*** у словах?

**Цуд, вецер, канцэрт, маці, станцыя, пшаніца, сцюжа, мяцеліца, кацяня.**

Падзяліце словы на дзве групы і запішыце. Якое слова трапіла ў абедзве групы? Чаму?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**204.** Прачытайце. Складзіце прыказкі з частак.

| | |
|---|---|
| Тр..ба рана ўстаць, | хто ад працы бяж..ць. |
| Цяжка таму ж..ць, | каб хлеба прыч..каць. |

Растлумачце правапіс прапушчаных літар. Адну прыказку запішыце пад дыктоўку.

Падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае гук [ц], адной рыскай, а літару, якая абазначае гук [ц’], — дзвюма рыскамі.

**205.** Прачытайце верш. У якіх словах вымаўляецца гук [ц’], а ў якіх — [ц]?

Цінькае сініца —
цэлы месяц сніцца:
цуд гасцюе
ў сініц —
цёпла ўзімку
ад суніц.

*М. Чарняўскі.*



Спішыце. Падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае гук [ц], адной рыскай, а літару, якая абазначае гук [ц’], — дзвюма рыскамі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**206.** Паслухайце тэкст. Чым знакамітая Белавежская пушча?

Прачытайце тэкст. Растлумачце выбар літары ў дужках.



Ведаеце, якая самая слав*(у/ў)*тая ў Беларусі п*(у/ў)*шча? Б..лавежская. Яна знаходзіцца на заха..е нашай р..спублікі, на м..жы з Польшчай. А самая гало*(у/ў)*ная *(у/ў)*краса пушч.. — б..лавежскі з*(у/ў)*бр. Гэта цар зв..роў, якія нас..ляюць пушчу. Ён — самы в..лікі і д*(у/ў)*жы. Можа паваліць рагамі др..ва, разбур..ць сц..ну з б..рвенняў. Можа нават на л..сной дарозе спыні..ь матац..кл і маш..ну. Але ён р..дка гэта робі..ь. Зубр — рахма́ны і спакойны звер, калі яго не чапаю..ь. *(У. Караткевіч.)*

Якія правілы прымянілі для вызначэння прапушчаных літар у словах?

Запішыце гэтыя словы па групах згодна з правіламі. Падкрэсліце ўстаўленыя літары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**207.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Віця слёзы выцірае —
іх цыбуля выціскае.

*С. Шах.*

Спішыце. Падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае гук [ц], адной рыскай, а літару, якая абазначае гук [ц’], — дзвюма рыскамі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

## Слоўнікавыя словы

| | |
|---|---|
| Радзі́ма | метро́ |
| бібліятэ́ка | ся́бар |
| дождж | аква́рыум |
| свя́та | мядзве́дзь |
| экску́рсія | чацве́р |
| ме́сяц | рукза́к |

## Тлумачальны слоўнік

**Ама́тар** — той, хто займаецца чым-небудзь не як прафесіянал; любіцель.

**Барво́вы** — ярка-чырвоны.

**Брод** — неглыбокае месца на ўсю шырыню ракі, возера, зручнае для пераходу.

**Бу́дзень** — будны, несвяточны дзень.

**Дыяме́нт** — алмаз, празрысты каштоўны камень.

**Дэкламава́ць** — выразна чытаць мастацкія творы.

**Кра́ска** — палявая кветка.

**Краяві́д** — агульны выгляд прыроды якой-небудзь мясцовасці.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Ку́хар** — той, хто гатуе стравы; повар.

**Начо́ўкі** — прадаўгаватая драўляная ці металічная пасудзіна для мыцця бялізны і іншых гаспадарчых патрэб.

**Пляце́нь** — агароджа з пераплеценых тонкіх галін.

**Пя́льцы** — рама, на якую нацягваюць тканіну для вышывання.

**Пярэ́сты** — пакрыты плямамі, палосамі рознага колеру.

**Святлі́ца** — светлы, чысты пакой у хаце.

**Спа́дчына** — з'явы культурнага жыцця, што засталіся з мінулых часоў.

**Става́ць** (стае́) — хапа́ць чаго-небудзь.

**Талака́** — калектыўная дапамога падчас выканання сельскагаспадарчых работ.

**Цыба́ты** — даўганогі.

**Цыру́льнік** — майстар, які займаецца галеннем, стрыжкай валасоў.

**Язмі́н** — куст з белымі пахучымі кветкамі, сабранымі ў невялікія гронкі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

# ЗМЕСТ

## РОДНАЯ МОВА

Беларуская мова — дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь ........................ 3
Вуснае і пісьмовае маўленне ................ 5
Родная мова. Ветлівыя словы ............. 8

## ГУКІ І ЛІТАРЫ

Гукі мовы. Абазначэнне гукаў літарамі ... 13
Алфавіт .......................................... 18
Вялікая літара ................................ 22
Знаёмства з арфаграфічным слоўнікам ... 26
Галосныя гукі. Абазначэнне галосных гукаў на пісьме літарамі ................. 29
Абазначэнне літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і*** галосных гукаў і мяккасці зычных гукаў . 32
Абазначэнне літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і*** гукаў [й’э], [й’о], [й’у], [й’а], [й’і] ............ 36
Падзел слова на склады ..................... 42
Падзел слова для пераносу ................... 49
Націск ............................................. 56



Спампавана з сайта www.aversev.by

Правапіс літар ***о, э — а*** ........................ 64
Правапіс літар ***е, ё — я*** ........................ 74
Зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме
літарамі ........................................ 88
Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў*** ........... 92
Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі .............. 102
Мяккі знак — паказчык мяккасці
зычнага гука ................................ 109
Гук [дз’]. Яго абазначэнне на пісьме .... 112
Гукі [д] і [дз’]. Іх абазначэнне на пісьме 114
Гукі [т] і [ц’]. Іх абазначэнне на пісьме 121
Гук [ц’]. Яго абазначэнне на пісьме ...... 124
Зацвярдзелыя зычныя гукі .................. 129

*Слоўнікавыя словы* ............................. 140
*Тлумачальны слоўнік* ......................... 140

Спампавана з сайта www.aversev.by

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Антановіч** Наталля Міхайлаўна
**Антонава** Надзея Уладзіславаўна

**Беларуская мова**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 1

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Г. Р. Ляткоўская*
Мастакі *М. А. Рацько, А. А. Тукач, В. М. Горбач*
Вокладка мастака *В. М. Горбач*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Музычэнка*
Карэктары *Н. В. Федарэнка, Г. М. Мазіна*

Падпісана да друку 19.07.2022. Фармат 70×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 4,34. Тыраж 14 069 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 от 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Спампавана з сайта www.aversev.by